Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

21 жніўня 2013 г. СЕРАДА № 155 (27520) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## Удзельнікам і гасцям XV Міжнароднага з'езда славістаў

**Дарагія сябры!**

Шчыра вітаю вас на беларускай зямлі і віншую з пачаткам працы XV Міжнароднага з'езда славістаў.

Славянскі свет — наша агульная духоўная Айчына, якая аб'ядноўвае мільёны людзей. На вучоных-славістаў ускладзена пачэсная місія — берагчы і памнажаць скарбы мудрасці і культуры, садзейнічаць распаўсюджванню ведаў пра славянскія народы. Вы з гонарам выконваеце яе і падтрымліваеце агонь, які запалілі першаасветнікі святыя Кірыл і Мяфодзій.

Сімвалічна, што месцам правядзення юбілейнага форуму абрана Беларусь — сэрца славянскай цывілізацыі, якая ўносіць важкі ўклад у захаванне яе каштоўнасцяў і ідэалаў. Беларусы берагуць гэтую спадчыну і заўсёды памятаюць аб тым, што толькі разуменне ўнікальнасці кожнай нацыі і яе духоўных здабыткаў не дасць братам-славянам страціць сябе ў глабалізаваным свеце.

Упэўнены, што гэты з'езд дапаможа ўсім нам лепш зразумець ролю славянства ў цывілізацыйным працэсе, аб'яднаць намаганні ў вывучэнні і папулярызацыі гісторыі, моў і культур нашых народаў.

Жадаю вам плённай працы, цікавых дыскусій і абмеркаванняў, моцнага здароўя і невычэрпных сіл дзеля служэння высакароднай справе славянскага адзінства.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

# НІХТО НЕ ПАВІНЕН РАЗМАЎЛЯЦЬ З БЕЛАРУССЮ З ПАЗІЦЫІ ВАЕННАЙ СІЛЫ

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 20 жніўня на нарадзе аб далейшых напрамках будаўніцтва і развіцця Узброеных Сіл краіны, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**



Фота БЕЛТА.

Пры гэтым Прэзідэнт падкрэсліў, што любая дзяржава выбудоўвае свае Узброеныя Сілы ў залежнасці ад таго, якая міжнародная абстаноўка, і асабліва ў тым рэгіёне, у якім даводзіцца жыць і працаваць. На думку кіраўніка дзяржавы, ваенна-палітычная абстаноўка ў свеце ў апошнія дзесяцігоддзі сведчыць аб сур'ёзных зменах у сферы міжнародных адносін: «Іх сутнасць зводзіцца да таго, што «ўладары свету» прадаўжаюць аказваць націск на знешнюю і ўнутраную палітыку так званых непажаданых дзяржаў. Пры гэтым выкарыстоўваюцца розныя механізмы, уключаючы прымяненне сродкаў узброенай барацьбы».

Калі аб гэтым гаварыць у адносінах да Беларусі, то, на шчасце, да гэтага не дайшло і наўрад ці дойдзе, лічыць Прэзідэнт. Але, на яго думку, выкарыстоўваюцца іншыя меры ўздзеяння на Беларусь, перш за ўсё, з боку заходніх дзяржаў і блока НАТА, у тым ліку ЗША.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што апошнім часам абстаноўка ў свеце развіваецца вельмі бурна і пажаданыя дзяржавы ўжо сталі непажаданымі. «Нават да смешнага даходзіць: звергнулі ўсё, што можна было звергнуць, па арабскай дузе — на поўначы Афрыкі і на ўсходзе. Цяпер па-новаму пачынаюць звяргаць, выступаючы міратворцамі, асабліва Еўрапейскі саюз», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «З'яўляючыся інструментам недапушчэння вайны, нашы Узброеныя Сілы павінны быць гатовы ў новых умовах да абароны суверэнітэту, незалежнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці краіны», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы перакананы, што беларуская армія павінна быць адэкватнай выклікам і пагрозам XXI стагоддзя. «Аднак сродкі павінны быць укладзены ў развіццё Узброеных Сіл, якія адпавядаюць рэаліям сённяшняга дня», — лічыць Аляксандр Лукашэнка. Таму далейшыя захады па развіцці арміі павінны быць усебакова ўзважанымі і падлічанымі.

Прэзідэнт таксама адзначыў, што за апошнія гады нямала зроблена па развіцці розных баявых сістэм і тэрытарыяльнай абароны, прывядзенні ў належны выгляд ваенных гарадкоў і іншых аб'ектаў інфраструктуры. «У бліжэйшы час і я, і іншыя адказныя за гэта зоймуцца кантролем у гэтай сферы. У гэта ўпісваюцца і нашы вучэнні сумесна з Расійскай Федэрацыяй «Захад-2013», — паведаміў ён.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу на тое, што мэта сённяшняй нарады — прааналізаваць стан Узброеных Сіл, існуючыя праблемы і вызначыць шляхі іх вырашэння ў сучасных умовах. «Я хацеў бы, каб было сказана і аб тых лішках узбраення, прадукцыі ваеннага прызначэння, якія сёння знаходзяцца ва Узброеных Сілах, і якія нам у прынцыпе не патрэбны ў сувязі з тым, што ідзе мадэрнізацыя Узброеных Сіл, і што мы з імі будзем рабіць, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Жадаючых набыць такое ўзбраенне сёння дастаткова. Калі мы недзе зможам рэалізаваць яго, то гэта трэба зрабіць, мы гэта не скрываем».

Прэзідэнт лічыць, што неабходна па-гаспадарску паставіцца да лішкаў прадукцыі ваеннага прызначэння ва Узброеных Сілах. «Ад іх, вядома ж, трэба пазбаўляцца (пакуль гэта прадукцыя не ўстарэла і патрэбна каму-небудзь), не парушаючы міжнародных абавязацельстваў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка акцэнтаваў увагу і на неабходнасці спакойна прадоўжыць работу па аптымізацыі структуры і скарачэнні колькасці Узброеных Сіл. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што Узброеныя Сілы ў свой час даходзілі да 200 тыс. чалавек, сёння іх каля 100 тыс. «Нам сёння такая колькасць не патрэбна, сёння не колькасць важна для Узброеных Сіл, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але аптымізацыя павінна ісці ў тым рэчышчы, у якім яна ішла да гэтага часу».

СТАР. 2

# КАВАЛЬСКАЯ СПРАВА — У СПАДЧЫНУ



**Жыхар гарадскога пасёлка Ушачы Генадзь Карэйша да кавальскай справы прыйшоў у даволі сталым узросце. Але, колькі сябе памятае, яго заўсёды прываблівў агонь у горне, гаркаваты пах кузні і, галоўнае, жаданне скарыць метал, разагрэты да чырвонага колеру. У маладосці, калі працаваў калгасным вадзіцелем, ён часта наведваў на мехдвары куток каваля-чараўніка, якому лёгка падпарадкоўваўся любы жалезны кавалак. «Было б жаданне — і кожны можа стаць выдатным майстрам», — казаў некалі Генадзю стары вясковы каваль.**

Гэтыя словы сёння Генадзь Карэйша кажа свайму сыну Ігару, перадаючы юнаку сакрэты «гарачага» майстэрства.

— Хачу каб сын спазнаў і зразумеў тую непаўторную радасць, калі адчуваеш сваю сілу над металам, калі прыходзіць майстэрства і робішся здольным выкаваць нават ружу!

Але, каб каваць ружы і вінаградныя гронкі, Генадзю давялося «сабаку з'есці» на простых рэчах, неабходных у сялянскай гаспадарцы альбо ў гаражы звычайнага аўтааматара. Гэта цяпер ён лёгка куе мудрагелістай формы рашоткі, карнізы, агароджы і робіць любую рэч, як сапраўдны мастак, — прыгожа, вытанчана, лёгка. А некалі да ночы стаяў з молатам над накавальняй, каб дасягнуць гармоніі ліній у звычайных дзвярных завесах альбо клямцы.

Адна з удалых прац каваля Карэйшы — лаўка, масток, казырок над ганкам, вароты і агароджа, усталяваныя ў санаторыі «Лясныя азёры» пад Ушачамі.

— Каб дасягнуць прызнання і гэткіх заказаў, патрэбны доўгія гады працы і цярпення: кавальская справа — няспешная. Але яе добры вынік не на дзесяцігоддзі — на стагоддзі.

Я заспеў каваля і яго сына-вучня за працай у невялікай майстэрні на ўскрайку пасёлка. Даўно не чуў, як звонам разыходзяцца гукі ўдараў малаткоў па гарачым метале! У горне палаў агонь — першы памочнік кавалёў. На доўгія размовы часу не было. Гаспадар паправіў сыну шапку, яны ўсміхнуліся — і звонкая праца зноў закіпела...

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**



*ЛІЧБА ДНЯ*

**Br340,1 трлн**

*склаў аб'ём валавага ўнутранага прадукту ў студзені—ліпені 2013 года. ВУП павялічыўся ў параўнанні з аналагічным леташнім перыядам на 1,4%. Прадукцыйнасць працы па валавым унутраным прадукце за першае паўгоддзе дасягнула Br62,8 млн, што склала 102,5% да такога ж перыяду летась. Удзельная вага інавацыйнай прадукцыі ў агульным аб'ёме адгружанай склала ў студзені—ліпені 18,1%. Інвестыцыі ў асноўны капітал за гэты перыяд ўзраслі на 10,2% і дасягнулі Br102,6 трлн.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 21.08.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8920,00 | ▲ |
| Еўра | 11890,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 270,50 | ■ |
| Укр. грыўня | 1097,00 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 18° |
| Віцебск | + 28° |
| Гомель | + 27° |
| Гродна | + 16° |
| Магілёў | + 26° |
| Мінск | + 27° |

■ Востры ракурс

# У ЦЕНЮ ЛЯСНОГА БІЗНЕСУ

## Не зважаючы на закон і здзекваючыся з прыроды, зарабляюць браканьеры «ціхага палявання»



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Удалым прыкладам арганізацыі малога бізнесу сёння анікога не здзівіш, праўда? Бізнес, бізнес, бізнес — чуем мы штодзень, разумеючы: культ грошай ахоплівае ўсё новыя і новыя прасторы. Летам аб'ектам заробкаў становіцца лес. Ягадна-грыбныя бізнесмены працягваюць налёты. Часта празмерна ўпэўнена, настойліва, нахабна. Тады гутарка ідзе далёка не пра бізнесменаў. Справу маем з ягадна-грыбнымі браканьерамі.**

### У грыбы з граблямі

У 1990-я за кілаграм беларускіх лісічак еўрапейцы гатовы былі плаціць 5 долараў. Народ на радасцях бег у мясцовыя лясы з граблямі. Навошта? Каб разгрэбці мох і ўсімі праўдамі-няпраўдамі адкалупаць надзейна схаванае сямейства рыжых. Тым больш у Германіі дзейнічаў асобны прынцып: есці толькі маленькія. Грыбоў у той не такі ўжо і далёкі час у Беларусі было проста безліч.Толькі добры дождж цёплай ноччу — раніцай можна смела выбірацца ў лес і неабмежаваная колькасць кілаграмаў гарантавана. Чаго наш брат толькі і не зробіць дзеля абяцаных еўрапейскіх грошай!

Сёння айчынныя лясы напаткалі цудоўныя наступствы: колькасць грыбоў зменшылася ў разы. Лісічкі ёсць, але не так, каб процьма. За кілаграм гэтым летам давалі 20 тысяч рублёў. Крыху не дацягвае да 5 долараў, ці не так? Але справа не ў гэтым. Проста выдатна, калі хтосьці мае жаданне збіраць грыбы. Калі ласка, хадзі ляснымі сцежкамі, дыхай свежым паветрам, усміхайся... Карацей кажучы, радуйся жыццю. Можаш чыста з-за спартыўнага інтарэсу назбіраць вядро, ці два, ці тры. Хочаш — вары суп, хочаш — сушы на зіму. Тваё права. Калі ж грыбнік адчувае, што яму і мора па калена, маючы адзін-адзіны аргумент: «Што хачу — тое і раблю»... Не, гэта ўжо нахабства. Адмыслова для грыбнікоў, чые хаты на перыферыі, ёсць такое паняцце, як дзяржаўная лясная ахова.

СТАР. 4

■ Культурнае вымярэнне

# СЛАВІСТЫ: што пра іх трэба ведаць

**Слова «славісты» днямі будзе гучаць часта: сёння адкрыццё Міжнароднага з'езда ў канцэртнай зале «Мінск». У гісторыю правядзення з'ездаў навукоўцаў, якія вывучаюць адметную культуру славянскага свету ва ўсім яе багацці, упісаны назвы розных краін. Першай яго прымала ў 1929 годзе чэшская Прага. Адметна, што бывалі і адмены з'ездаў з-за выключнай сітуацыі ў адной са славянскіх краін: у 1939 годзе трэці з'езд не адбыўся з-за таго, што ў Польшчы ўжо кіпела Другая сусветная вайна. І толькі ў 1955 годзе справа трэцяга з'езда была завершана ў Бялградзе на міжнароднай славістычнай канферэнцыі. Прымалі з'езд славістаў нашы суседзі: у Маскве (1958 год), у Кіеве (1983), а Польшчы пашчасціла двойчы — у 1973-м і 1998 гадах. І Беларусь дачакалася — можа, менавіта ў той момант, калі яе культуры патрэбна асэнсаванне праблем на навуковым узроўні, каб выпрацаваць кірункі яе далейшага развіцця. Калі патрэбна разуменне, што ў нашай культуры дапамагае краіне існаваць. І каб суаднесці погляд знутры з поглядамі звонку.**

### Для чаго патрэбны з'езд?

Вядома, бываюць канферэнцыі, сустрэчы, дзе можна абмеркаваць нейкія тэмы, падыскутаваць. Але з'езд — гэта найбольш шырокая форма міжнароднага навуковага супрацоўніцтва славістаў. Міжнародныя з'езды і канферэнцыі арганізоўвае Міжнародны камітэт славістаў — з мэтай абмеркавання і вырашэння важных навуковых пытанняў славістыкі. Камітэт і кіруе з'ездам.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### АМАЛЬ ТРЭЦЬ УКРАІНЦАЎ АДМОВІЛАСЯ АД ДЗЯРЖАЎНАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ



Значная частка ўкраінцаў адмовілася б падтрымаць абвяшчэнне незалежнасці краіны, калі б перад імі цяпер паўстаў такі выбар. Пра гэта сведчаць вынікі даследавання, праведзенага сацыялагічнай групай «Рэйтынг». Супраць абвяшчэння незалежнасці, паводле даследавання, выказаліся 28% рэспандэнтаў. За незалежнасць — 61%. Астатнія, як высветлілася, не маюць пэўнага меркавання па гэтым пытанні. Прапарцыянальна прыхільнікаў незалежнасці, па інфармацыі сацыёлагаў, больш за ўсё на захадзе Украіны, на поўначы і ў цэнтральнай частцы краіны — каля 70 працэнтаў, на ўсходзе і поўдні — менш за палову. Сярод тых, хто лічыць роднай мовай украінскую, за абвяшчэнне незалежнасці выказалася каля 80%. Сярод тых, для каго родныя і ўкраінская, і руская мовы, — каля паловы. Калі зыходзіць з палітычных прыхільнасцяў, прыхільнікі незалежнасці дамінуюць сярод прыхільнікаў Кампартыі Украіны. У шэрагах прыхільнікаў кіруючай Партыі рэгіёнаў, паводле даследавання, такіх каля 40%.

### У КАЗАХСТАНЕ ПЛАНУЮЦЬ ПАВЯЛІЧЫЦЬ ПРАЦЯГЛАСЦЬ ЖЫЦЦЯ ПРАЗ ЁДАВАННЕ ПРАДУКТАЎ

У Казахстане плануецца ўвесці з 2014 года абавязковае ёдаванне мукі і солі, паведаміў віцэ-міністр аховы здароўя Эрык Байжунусаў. «Пасяджэнне ўрада падтрымала гэтую ідэю, і калі ўсе нашы разлікі пацвердзяцца, то з наступнага года мы гатовы пачаць абавязковае ёдаванне мукі і солі», — сказаў Эрык Байжунусаў. Прадстаўнік Дзіцячага фонду ААН ЮНІСЕФ у Казахстане Джун Кукіта падчас выступлення на пасяджэнні ўрада адзначыў, што гэтая мера будзе спрыяць зніжэнню дзіцячай смяротнасці, а таксама павелічэнню працягласці жыцця казахстанцаў у цэлым па рэспубліцы.

«Мы прапануем інвеставаць у прафілактыку недахопу ёду, а таксама вітамінаў А і В. Людзі могуць прымаць гэтыя вітаміны з дапамогай хлеба, калі мы будзем дадаваць ёд і іншыя вітаміны ў муку — гэта прадухіліць анемію і дапаможа павысіць нараджальнасць у цэлым па Казахстане», — падкрэсліў прадстаўнік фонду.




ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ХАРАКТАР ЧАЛАВЕКА ЗАЛЕЖЫЦЬ АД ТАГО, КАЛІ ЁН КЛАДЗЕЦЦА СПАЦЬ



Калі чалавек з'яўляецца «савой», негатыўныя рысы характару накшталт нарцысізму, псіхапатыі, беспрынцыповасці і несумленнасці абавязкова выяўляцца. Пра гэта папярэджваюць спецыялісты з Сіднея і Ліверпуля, адзначае The Sunshine Coast Daily. У прыватнасці, доктар Пітэр Ёхансан з Універсітэта Заходняй Аўстраліі даследаваў 263 чалавек і ўстанавіў: дрэнны характар часцей быў у людзей, у якіх кагнітыўныя і метабалічныя функцыі актывізаваліся напрыканцы дня. Магчыма, тут адыгрывае галоўную ролю псіхалагічны аспект. Увечары прасцей парушаць прынятыя правілы. Вынікі іншых даследаванняў, прысвечаных гэтаму пытанню, сведчаць: у «соў» больш пазітыўных рыс. Яны знаходлівыя, з'яўляюцца экстравертамі і адрозніваюцца крэатыўным складам розуму. Праўда, «жаўрукі» добрасумленныя, маюць ярка выражаныя аналітычныя якасці і добрую паспяховасць у школе. Пры гэтым у «соў» нярэдка дыягнастуецца дэпрэсія, а ў «жаўрукоў» — трывожнасць. У любым выпадку, хранатыпы («совы» / «жаўрукі») абумоўлены генетыкай. Чалавек можа наладзіць рэжым і прымусіць сябе ўставаць у пэўны час. Але ў выніку ён вернецца да свайго хранатыпу.

Анатоль ТОЗІК:

# «ШКОЛА ДЛЯ ПЕДАГОГАЎ ПАВІННА БЫЦЬ СЭНСАМ ЖЫЦЦЯ»

**«Чым сённяшняя школа адрозніваецца ад школы, скажам, трыццацігадовай даўнасці?» — пацікавіліся журналісты ў віцэ-прэм'ера беларускага ўрада Анатоля ТОЗІКА падчас наведвання ім форуму педагагічных работнікаў горада Мінска. Кожнаму навучальнаму году папярэднічаюць традыцыйныя жнівеньскія педагагічныя канферэнцыі, якія праходзяць гэтымі днямі ва ўсіх рэгіёнах краіны. Лейтматывам форуму сталічных педагогаў сталі праблемы якасці адукацыі...**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

— Калі праводзіць паралелі паміж сучаснай школай і той школай, у якой калісьці я навучаўся, то даводзіцца канстатаваць, што ў мае часы ў школе было больш настаўнікаў, для якіх школа была не проста работай, а была іх жыццём, — падкрэсліў Анатоль Тозік. — І, шчыра кажучы, вельмі хацелася б, каб такіх настаўнікаў прыходзіла ў школы больш, каб для маладых педагогаў школа станавілася сэнсам іх жыцця, каб яны мелі магчымасць самарэалізоўвацца ў сваёй рабоце. Але я разумею, што і мы для настаўнікаў павінны ствараць адпаведныя ўмовы. Трэба думаць над тым, як прыцягнуць у педагагічныя ВНУ матываваных выпускнікоў. З 1 верасня мы павышаем тарыфныя стаўкі педагагічным работнікам на 25%. Магчыма, гэта і не вельмі адчувальнае павышэнне з улікам павышэння штотыднёвай нагрузкі на настаўнікаў з 18 да 20 гадзін, але ўсё ж такі хоць крыху, але яго павінны адчуць і тыя педагогі, якія і раней працавалі з нагрузкай 20 гадзін і больш. Мяркую, што да канца гэтага года мы штосьці яшчэ зможам зрабіць для педагогаў у плане павышэння іх заробкаў. Хачу звярнуць таксама ўвагу на яшчэ адзін рэсурс — выкарыстанне пазабюджэтных сродкаў.

СТАР. 2

КОРАТКА

У Беларусі ў студзені—ліпені 2013 года за кошт усіх крыніц фінансавання ўведзена ў эксплуатацыю 2 815,3 тыс. кв.м агульнай плошчы жылля, што на 6,5 працэнта больш у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.

Рэальная заработная плата работнікаў Беларусі (без суб'ектаў малога прадпрымальніцтва недзяржаўнай формы ўласнасці) у студзені—чэрвені гэтага года склала 120,5 працэнта да студзеня—чэрвеня мінулага года. Намінальная налічаная сярэднямесячная заработная плата ў студзені—чэрвені 2013 года была Br4 млн 770,9 тыс., што складае 145,8 працэнта да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года.

Нацыянальная авіякампанія «Белавія» сумесна з партнёрамі — заказчыкамі чартарных перавозак прыняла рашэнне аб прыпыненні рэйсаў у Егіпет у верасні. Гэта звязана са складанай палітычнай сітуацыяй у названай краіне.

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

21 жніўня 2013 г.
№ 14 (312)


НОУ-ХАУ

## ТВОРЧЫ ПАЧАТАК

### Алея каваных ліхтароў з'явілася ў Брэсце

Святлана ЯСКЕВІЧ

**Да 1000-годдзя Брэста застаецца шэсць гадоў. Хочацца спадзявацца, што на юбілей да нас прыедзе шмат гасцей і кожны з іх знойдзе нешта для сябе цікавае ў самым заходнім горадзе Беларусі. Гэтая тэма даўно абмяркоўваецца грамадскасцю горада, некалькі разоў яе выносілі на парадак дня сесій гарадскога Савета дэпутатаў. Пад эгідай гарвыканкама дзейнічае савет-камісія па выпрацоўцы канцэпцыі стварэння гісторыка-культурнага комплексу «Брэст».**



Чатыры гады таму на скрыжаванні Савецкай і Гогаля ўзведзены помнік, на якім адлюстраваны асноўныя вехі 1000-гадовай гісторыі Брэста. Годам пазней на вуліцы Савецкай урачыста запалілі ліхтары з газай. Цяпер рэдкі госць не пажадае сфатаграфаваць ліхтаршчыка, які ўвечары запальвае святло.

А сёлета па вуліцы Гогаля з'явілася алея арыгінальных каваных ліхтароў, якая і стала яшчэ адной славутасцю. Яна нават прэтэндуе на «візітоўку» абласнога цэнтра. Амаль каля кожнага ліхтара цяпер спыняюцца гараджане і турысты: робяць здымкі, абмяркоўваюць, дзеляцца ўражаннямі.

Як аказалася, ідэя алеі ліхтароў належыць старшыні гарвыканкама Аляксандру Палышанкову. Дарэчы, мэр з самага пачатку выказаўся за тое, каб праект быў рэалізаваны без прыцягнення бюджэтных сродкаў.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*



МЯСЦОВЫ ЧАС

## «МАЛІНАВЫ РАЙ» У ГІЖЭНЦЫ

**У Гіжэнскім сельсавеце Слаўгарадскага раёна жыхары разам з мясцовай уладай і фондам развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра» ажыццяўляюць праекты, карысныя ў першую чаргу для бяспекі людзей на пацярпелых ад Чарнобыля тэрыторыях.**

Ілона ІВАНОВА

### Бяспечная ягада

Раніцу 12-гадовая жыхарка Гіжэнкі Святлана Пуземчык сустракае на сямейнай малінавай дзялянцы. Дзяўчынка збірае з кустоў буйныя чырвоныя ягады, кідае ў вядро.

— Я звычайна гадзіны тры на дзень маліну збіраю, — гаворыць яна. — Маці мне за гэта палову выручкі аддае. Грошы ідуць на марожанае для мяне і розныя ласункі для маці, а астатняе выдаткую на школьныя тавары.

Святлана і яе бацькі — удзельнікі групы сялян пад сімвалічнай назвай «Малінавы рай». Пры дапамозе фонду «Адраджэнне-Агра» і Праграмы развіцця ААН, пры падтрымцы сельвыканкама яны атрымалі саджанцы маліны, а сёлета ўжо збіраюць нядрэнны ўраджай. Да слова сказаць, у групе 19 сямей, у тым ліку і сама старшыня Гіжэнскага сельсавета Тамара Мельнікава.

— Ягады, якія збіраюць у лясах Слаўгарадчыны, могуць быць забруджанымі радыяцыяй, — расказала Тамара Францаўна. — Між тым, маліна добрых гатункаў, не толькі буйная і смачная, але яшчэ і чыстая, бяспечная для здароўя людзей. Вось мы і аб'ядналіся ў адну суполку дзеля агульнага інтарэсу. А цяпер стала ясна, што наша «новая маліна» можа прыносіць і дадатковы прыбытак.

### Ураджай — да снегу

Святлана Віктараўна Малашанка з дачкой Светай запрашаюць: «Заходзьце ў маліну!»

— Я сама люблю маліну, раблю з яе кампоты і варэнне, — расказвае 44-гадовая жанчына, якая працуе загадчыцай дзіцячага садка ў Гіжэнцы. — Мы аднойчы памеркавалі з сям'ёй, што, акрамя жывёлагадоўлі, у хатняй гаспадарцы трэба нешта яшчэ. Спачатку думалі пра яблыневы сад, але ўсё ж такі спыніліся на маліне. Энтузіясты стварылі «Малінавы рай».

Праўда, у гэтым раі выпадае не адпачываць, а добра працаваць! Навокал — некалькі соцень кустоў, рознай вышыні. У зеляніне кожнага знаходзяцца ягады, якія так і цягне паклаcці ў рот. Гаспадары, падаецца, не маюць пярэчанняў: кажуць, што рэмантантная маліна пачынаецца ў чэрвені і будзе даваць ураджай да позняй восені. Адну ягаду здымаеш — побач вырастае новая.

— Летась маліна была аж да снегу, — кажа Святлана Віктараўна. — Але ў самы пік гэтага сезона мы збіралі з нашага ўчастка па 2 вядры ў дзень. Спачатку прадавалі тут, сваім, і ў бліжэйшай акрузе. Потым далі аб'яву ў газету ў Слаўгарадзе. Літр маліны — 15 тысяч рублёў, вялікае вядро — адпаведна, 150 тысяч. Ну і, натуральна, для саміх сябе хапіла. У нас цяпер дома багацце — дзясяткі літраў варэння.

### «Зялёныя» рукі

Бацька сямейства, Мікалай Іванавіч Пуземчык, падаецца, больш захапляецца вырошчваннем буякоў, якія пасадзілі на ўчастку побач з малінай.

— У мясцінах, дзе я нарадзіўся і вырас, збіралі буякі (ці дурніцы, як іх заўсёды называлі вяскоўцы), бо гэта вельмі карысная ягада, і мне яна падабаецца з дзяцінства, — расказвае мужчына. — Аднак пасля чарнобыльскай аварыі там моцная радыяцыя, і дары лесу збіраць небяспечна. Тым больш у вільготных месцах, дзе звычайна і растуць буякі. А вось такім чынам, на зямельным участку, я першым у Слаўгарадскім раёне стаў вырошчваць гэтую ягаду.

Справа новая, але вельмі перспектыўная, лічыць Мікалай Іванавіч. У Гіжэнцы цяпер растуць кусты амерыканскай селекцыі. Яны, падобна на тое, будуць высокімі, ледзь не ў рост чалавека. Але ягады і цяпер, у першы год, уражваюць і сваім значным памерам, і непаўторным смакам.

— З буякамі добра, таму што на рынку збыту пакуль няма канкурэнцыі, — разважае гаспадар. — За кілаграм буякоў можна атрымаць 3-4 долары ў эквіваленце. Гэтую ягаду цэняць за тое, што яна паляпшае зрок і здымае стомленасць. На такі рэдкі тавар пакупнікі заўсёды знойдуцца. Мы пасадзілі больш за 150 кустоў. Адзін куст каштаваў тады 30 тысяч рублёў. З цягам часу ўсё гэта акупіцца.



Між тым, вырошчванне буякоў — гэта не самая простая справа. Тут трэба і ў глебе разбірацца, і ў нюансах апрацоўкі, і нават у правільным паліве кустоў. «У Мікалая Пуземчыка — «зялёныя» рукі: што ні кіне ў зямлю, тое добра расце», — так пра яго гаворыць аднавяскоўцы. І нездарма: Мікалай Іванавіч любіць расліны, ды і старэйшая дачка Кацярына, якая працуе аграномам, заўсёды можа даць параду.

### Вырасціць — паўсправы

Маліна — гэта для сямейнага бюджэту плюс, і ўжо даволі важкі. Святлана Малашанка падлічвае: прадалі каля трох дзясяткаў вядзёр маліны, атрымалі прыбытак каля 4-х мільёнаў рублёў. Гэтым самым сям'я кампенсавала выдаткі на сеткавую агароджу вакол малінава-буяковага ўчастка.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

ПАСЛЯ ВЫСТУПЛЕННЯ «МС»

## ХТО Ў АДКАЗЕ ЗА СТАРЫЯ ДРЭВЫ?

**У «Мясцовым самакіраванні» (за 1 жніўня г.г.) жыхары дома № 36 па вуліцы Янкі Маўра, што ў сталіцы, скардзіліся на старыя дрэвы, якія зацяняюць вокны, не прапускаюць у кватэры святло ды і ўвогуле ствараюць аварыйную сітуацыю. З гэтай нагоды намеснік кіраўніка адміністрацыі Фрунзенскага раёна Васіль Шашок даслаў ліст, дзе акцэнтуе ўвагу жыхароў пяціпавярховіка на працэдуры выдалення дрэў і кустоў.**

Як адзначае спецыяліст, сітуацыю рэгулюе пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 25 кастрычніка 2011 года №1426 «Аб некаторых пытаннях абыходжання з аб'ектамі расліннага свету». Паводле дакумента, выдаленне і перасадка аб'ектаў расліннага свету ажыццяўляецца з дазволу мясцовага выканаўчага і распарадчага органа. Нагодай да яго могуць з'яўляцца абставіны, якія перашкаджаюць эксплуатацыі будынкаў, збудаванняў ды іншых аб'ектаў, выкарыстанню зямельных надзелаў па мэтавым прызначэнні, або знаходжанне дрэў у неналежным, у тым ліку аварыйным стане.



Каб атрымаць дазвол на выдаленне, зацікаўленыя юрыдычная або фізічная асобы, у тым ліку індывідуальныя прадпрымальнікі, **прадстаўляюць у мясцовы выканаўчы і распарадчы орган заявы на выдаленне, перасадку раслін у населеных пунктах. Гэтыя ж органы пры наяўнасці ў заяве сведчанняў пра абставіны, пры якіх расліны ствараюць вышэйзначаныя перашкоды (а ў гэтым выпадку парушаюць інсаляцыю і асветленасць у жылым памяшканні), робяць запыт у спецыяльна ўпаўнаважаную арганізацыю — у нашым выпадку ў Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі Фрунзенскага раёна.**

Па словах адказнай асобы, на дату публікацыі ў «Мясцовым самакіраванні» ад жыхароў дома № 36 па вуліцы Янкі Маўра ў ЖЭС № 48 або ЖРЭА № 1 Фрунзенскага раёна Мінска ніводнай заяўкі не паступала. Пры штатным аглядзе тэрыторыі выяўлены два дрэвы — бяроза і клён ясенепадобны, якія **знаходзяцца ў неналежным стане.** Па выніках абследавання аформлены і перададзены ва ўнітарнае прадпрыемства «Зелянбуд» Фрунзенскага раёна пакет належных дакументаў для ўзгаднення і наступнага выдалення дрэў.

Найбольш просты шлях для жыхароў дома, якія лічаць, што дарослыя дрэвы не прапускаюць дзённае святло, — пісьмова звярнуцца ў Цэнтр гігіены і эпідэміялогіі Фрунзенскага раёна па адрасе: 220073 г. Мінск, вул. Харкаўская, д. 11 з просьбай правесці замеры асветленасці ў іх кватэрах. Для фізічных асоб гэтая працэдура бясплатная. Пасля атрымання заключэння з пацвярджэннем неадпаведнасці нормам асветленасці для жылога памяшкання, трэба прынесці яго ў ЖЭС № 48 або ЖРЭА № 1 і пакінуць адпаведную заяўку. Супрацоўнікі жыллёвых службаў возьмуць на сябе далейшыя клопаты па афармленні патрэбных згодна з заканадаўствам дакументаў, а пасля іх атрымання — па выдаленні вызначаных аб'ектаў расліннага свету.

Спецыяліст паведамляе, што пасадка новых зялёных насаджэнняў таксама ўзгадняецца з жыллёва-камунальнымі службамі. Так, нельга высаджваць дрэвы бліжэй чым за 5 метраў, а кусты бліжэй за 1,5 метра ад сцяны будынкаў і збудаванняў. Існуе таксама мноства іншых абмежаванняў.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

КАМПЕТЭНТНА

Іван ЛІПНІЦКІ:

## «ДУША БАЛІЦЬ, КАЛІ БАЧУ «СЛЯДЫ» АД «АКТЫЎНАГА» АДПАЧЫНКУ»



**У Мінскай вобласці 2013 год аб'яўлены Годам навядзення парадку на зямлі і добраўпарадкавання. Аб тым, што ўжо зроблена, наш карэспандэнт гутарыць са старшынёй абласнога Савета дэпутатаў Іванам ЛІПНІЦКІМ.**

**— Іван Эдуардавіч, для вобласці тэма года не новая: навядзеннем парадку на зямлі займаліся і летась, і пазалетась... Чым адметны 2013 год у гэтай справе?**

— Калі вельмі лаканічна, то комплексным падыходам да вырашэння злабадзённых праблем, яшчэ большай канцэнтрацыяй намаганняў на загадзя вызначаных кірунках дзейнасці і, на мой погляд, лепшай выніковасцю работы райсаветаў і сельсаветаў. Гэта дасягнута ў значнай ступені дзякуючы распрацоўцы абласнога плана па навядзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні тэрыторый. У дакуменце вызначаны мерапрыемствы на год, указаны тэрміны выканання і адказныя асобы.

**— Вядома, яшчэ пакуль рана гаварыць аб зробленым за год, але ўсё ж можна падвесці папярэднія вынікі — у прыватнасці, акрэсліць тыя задачы, на якіх цяпер засяроджаны намаганні Саветаў?**

— Якраз нядаўна ў Барысаве мы абмяркоўвалі гэтую праблематыку на сумесным выязным пасяджэнні прэзідыума Мінскага абласнога Савета дэпутатаў і абласнога штаба па навядзенні парадку на зямлі, які ўзначальвае намеснік старшыні аблвыканкама Васіль Іванавіч Акуліч. У размове ўдзельнічалі члены прэзідыума Мінскага аблсавета і абласнога штаба, старшыні раённых Саветаў дэпутатаў, а таксама начальнікі раённых інспекцый прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, былі запрошаны таксама і прадстаўнікі тых абласных службаў, якія ў той ці іншай ступені маюць дачыненне да тэматыкі пасяджэння.

Перад тым, як сабрацца ў вялікай зале, усе пабывалі на аб'ектах і тэрыторыях, у прыватнасці, Барысаўскага раёна, на свае вочы ўбачылі як здабыткі, так і асобныя недапрацоўкі, праблемныя моманты ў дзейнасці мясцовай улады, над вырашэннем якіх яшчэ трэба працаваць. Мы імкнуліся, каб гэта была не экскурсія, а знаёмства з канкрэтным досведам, вартым пераймання.

Напрыклад, у Мінскім, Пухавіцкім, Смалявіцкім, Дзяржынскім раёнах, дзе шмат садаводчых таварыстваў і многія тысячы дачных пабудоў, даволі паспяхова вядуць барацьбу з несанкцыянаванымі звалкамі. Доўгі час яны былі моцным «забруджвальным фактарам» лясоў, псавалі іх знешні выгляд, раздражнялі і абуралі людзей, неабыякавых да захавання роднай прыроды. Сёння праблема вырашаецца двума шляхамі: мы дамовіліся аб абавязковым прыбіранні ў нядзелю вечарам і раніцай у панядзелак прыдарожных скрынь для смецця на аўтобусных прыпынках. Звычайна ў гэтыя дні яны перапоўнены пакетамі з бутэлькамі і рэшткамі ежы. Карыстаючыся выпадкам, звяртаюся да мінчан і гасцей Міншчыны: выкідайце смецце ў скрыні, выстаўленыя ў спецыяльных месцах. Па другое, сельскія Саветы праводзяць мэтанакіраваную работу са старшынямі садаводчых таварыстваў па арганізацыі за пэўную плату вывазу з іх тэрыторыі бытавых адходаў.

Потым пасля паездкі ўжо ў Барысаве адбылася прынцыповая і адкрытая размова. Выступіў кожны старшыня раённага Савета. Яны расказалі аб зробленым згодна з планам, унеслі канкрэтныя прапановы па паляпшэнні работы, выказалі свой погляд на існуючыя праблемы. Увогуле шмат цікавага і карыснага напрацавана Саветамі ў раёнах вобласці, ёсць чым падзяліцца з калегамі з іншых рэгіёнаў. Нагадаю, лейтматыў усёй размовы ў Барысаве — неабходна ўзмацніць тлумачальную работу з людзьмі па месцы жыхарства. Зразумела, не забываць і такі інструмент уздзеяння на нядобрасумленных грамадзян, як штрафы, адміністрацыйныя пакаранні... Але парадак і чысціня будуць толькі тады, калі кожны з нас усвядоміць, што навакольнае асяроддзе трэба і берагчы, і ахоўваць.

У прыватнасці, старшыня Лагойскага раённага Савета Пётр Вабішчэвіч расказаў, як па ініцыятыве дэпутатаў, пачынаючы з красавіка, дзейнічаюць рабочыя групы па навядзенні парадку на зямлі. Кожны тыдзень шэсць такіх груп выязджаюць на замацаваныя

> **Кожны тыдзень шэсць груп выязджаюць на замацаваныя за імі тэрыторыі і, па магчымасці, аказваюць метадычную і практычную дапамогу на месцах.**

за імі тэрыторыі і, па магчымасці, аказваюць метадычную і практычную дапамогу на месцах. У іх складзе — работнікі арганізацый і ўстаноў раёна, якія пры неабходнасці садзейнічаюць сельсаветам ва ўстаноўцы і афарбоўцы платоў, прыбіранні могілак, пасадцы саджанцаў дрэў і кустоў. Штогод у раёне падводзяцца вынікі работы па добраўпарадкаванні сярод сельсаветаў, арганізацый і прадпрыемстваў, домабудаванняў грамадзян. Пераможцам уручаюцца дыпломы і грашовыя прэміі.

Зазначу, апошнім часам у сельсаветаў з'явілася адносна новая задача — выяўленне і ліквідацыя вакол населеных пунктаў шкодных, чужародных беларускай прыродзе раслін. Каб прадухіліць распаўсюджванне папуляцыі баршчэўніку Сасноўскага, у тым жа Лагойскім раёне арганізавана група з 12 чалавек, якія вядуць вайну з небяспечнай раслінай на тэрыторыі дзевяці сельсаветаў. Ну чым не карысны досвед?

**— Няўжо такія высілкі патрэбны для барацьбы з нейкім пустазеллем?**

— Баршчэўнік Сасноўскага — гэта сур'ёзны праціўнік, голымі рукамі не возьмеш. Яго скошваюць, выкопваюць, нават ужываюць ядахімікаты, а ён зноў адраджаецца. Трэба 11 гадоў запар скошваць расліну, каб яна перастала расці на ўчастку. Ці восенню выкапаць яе карані. Важная заўвага: далёка не кожнаму варта дазваляць з ёю змагацца. Бо гэта расліна ядавітая, яе сок можа нанесці шкоду чалавеку — сур'ёзныя балючыя апёкі. Таму баршчэўнік скошваюць людзі падрыхтаваныя, пасля інструктажу, у спецыяльнай вопратцы.

Не менш шкодны сумнік канадскі, які таксама праявіў сябе ў якасці здольнага прыстасаванца. Гэта сімпатычная зялёная расліна з жоўтымі кветкамі вельмі агрэсіўная. І чым хутчэй разгорнецца работа ў раёнах па выкараненні гэтых так званых інвазіўных небяспечных раслін-чужынцаў, тым лепш будзе для зямлі.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

ПРАВЕРКА

## З ДЗІЦЯЧАЙ ПЛЯЦОЎКІ Ў... БАЛЬНІЦУ

**Многія дзіцячыя пляцоўкі на Віцебшчыне, аказваецца, небяспечныя для здароўя і нават жыцця. Гэта высветлілася падчас пракурорскіх праверак. Адказным асобам пракуроры накіравалі адпаведнае ўказанне аб узмацненні нагляду і прыняцці канкрэтных мер.**

— Пры абследаванні дваццаці дваровых тэрыторый у Віцебску былі ўстаноўлены шматлікія парушэнні эксплуатацыі абсталявання дзіцячых гульнявых пляцовак. У прыватнасці, у двары дома № 32 па вуліцы Цэнтральная гарадскога пасёлка Руба, у непасрэднай блізкасці ад дзіцячай пляцоўкі знаходзіўся адкрыты каналізацыйны калодзеж глыбінёй каля 3 метраў.

А каля дзіцячай пляцоўкі на той жа вуліцы каля дома № 15 быў адчынены электрашчыток з аголенымі правадамі. За 5 метраў ад дзіцячай пляцоўкі ў двары дома № 34 таксама на вуліцы Цэнтральная падчас праверкі быў заўважаны цэлы «склад» бытавога смецця, і па перыметры двара яно было раскідана, — расказвае Антон Волкаў, старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці.

І ў самым цэнтры Віцебска пракурорам трапілі на вочы адкрытыя каналізацыйныя калодзежы, бруд, арэлі, якія могуць упасці, горкі, з якіх з'едзеш — і нагамі ў бетон...

Не лепш справы ў правінцыі. У райцэнтры Бешанковічы небяспечныя дзіцячыя гульнявыя пляцоўкі былі выяўлены на тэрыторыі 15 двароў. Некаторае абсталяванне ўвогуле ў аварыйным стане. Напрыклад, альтанкі маглі ў любы момант абваліцца. Горкі і арэлі не замацаваны (не забетанаваны), у пясочніцах няма пяску.

Як высветлілася падчас праверкі, не адпавядалі нормам бяспекі, знаходзіліся ў аварыйным стане 14 дзіцячых дваровых тэрыторый у Мёрах, 13 — у Полацку, столькі ж — у Талачыне і Коханаве, 10 двароў — у Лепелі, 6 пляцовак — у Сянно. Падобныя парушэнні мелі месца ў Браслаўскім, Верхнядзвінскім, Дубровенскім, Глыбоцкім, Докшыцкім, Расонскім раёнах.

— Здзіўляе тое, што прыведзеныя мною прыклады — гэта толькі нешматлікія факты бязладдзя. Пракуроры праводзілі праверкі выбарачна, аднак пагрозу здароўю і жыццю дзяцей выявілі прыкладна на 140 дваровых тэрыторыях і на тэрыторыях 10 школ, размешчаных у 18 рэгіёнах вобласці! У арганізацыі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, выканкамы, школы ўнесена 13 прадстаўленняў, вынесена 17 прадпісанняў.

Віцебскі аблвыканкам праінфармаваны пра вынікі праверак.

...Напэўна, можна канстатаваць: штогод у камунальнікаў проста «рукі не даходзяць» да навядзення парадку ў дварах.

Думаецца, што і самі жыхары дамоў маглі б падключыцца да навядзення парадку, паведамляць аб праблемах у камунальныя арганізацыі і органы ўлады, а не чакаць, пакуль на месца прыедзе пракурор.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# «ДУША БАЛІЦЬ, КАЛІ БАЧУ «СЛЯДЫ» АД «АКТЫЎНАГА» АДПАЧЫНКУ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

**— Летам часта праблемнымі з'яўляюцца месцы масавага адпачынку. Што робіцца для падтрымання там парадку?**

— Ды многае. Добраўпарадкоўваюцца пляжы, месцы для купання, стаянкі для турыстаў, аўтамабіляў і г.д. Ведаеце, душа баліць, калі бачыш чорныя плямы ад вогнішчаў, горы смецця і пустых бутэлек, нярэдка разбітых, пасля «актыўнага» адпачынку. Чамусьці некаторыя аўтааматары лічаць дазволеным заехаць на машыне ў возера ці раку і вымыць да бляску свайго жалезнага «каня». Хаця, упэўнены, усе ведаюць, што такія дзеянні недапушчальныя. Часам складваецца ўражанне, што некаторыя нашы сугрwelамадзяне ні жывуць адным днём у сэнсе стаўлення да прыроды, быццам бы сюды ўжо ніколі не вернуцца. Вяртаюцца, праўда, на ўжо прыбраныя за такімі дзікунамі пляжы і ўзбярэжжы. І зноў смецце...

**— Ліквідацыя аварыйных дрэў — дарагая паслуга для сельскіх пенсіянераў. Як тут сельсаветы працуюць?**

— Спілаваць і ўтылізаваць велізарнае дрэва, якое ў моцны вецер небяспечна хістаецца над вясковай хатай, б'е тоўстымі галінамі па даху — справа не простая, і як вы слушна заўважалі, нятанная. Не заўсёды сельсаветы маюць сродкі на масавую ліквідацыю аварыйных дрэў. Прымальна было б, на мой погляд, практыка, калі б выдаткі дзяліліся пароўну паміж гаспадаром дома і той арганізацыяй, якая бярэцца спілаваць дрэва. Людзі ўжо ведаюць, што перш чым пачаць гэтую работу, трэба адключыць электрычнасць, на вуліцы на пэўны час перакрыць рух машын і людзей, выканаць іншыя меры і правілы тэхнікі бяспекі.

Ды і зваліць дрэва трэба правільна. Тут не абысціся без абсталявання неабходнымі прыстасаваннямі аўтамабіля і кваліфікаваных спецыялістаў. Сваю задачу яны звычайна выконваюць хутка і якасна, без пашкоджанняў дамоў, іншых пабудоў. Дарэчы, у многіх сельсаветах ужо стварыліся чэргі ахвотных спілоўваць каля хаты аварыйныя дрэвы. Усе яны знаходзяцца на ўліку ў органах мясцовай улады.

**— Яшчэ адна роднасная праблема — знос старых хат-развалюх, якія сваім непрывабным выглядам псуюць вонкавы выгляд любога населенага пункта...**

— Дом знесці — не дрэва спілаваць. Тут можна сутыкнуцца з непрыемнасцямі юрыдычнага характару. Бо як бывае? Стаіць такі дом на курыных лапках не першы год без нагляду, паступова разбураецца, двор зарастае хмызняком, пустазеллем. Калі хто і заходзіць сюды, дык мясцовыя выпівохі. Менавіта па іх віне часцей за ўсё гараць кінутыя хаты. Сельсавет пэўны перыяд шукае гаспадара, не знаходзіць і вырашае знесці гэтую «прыгажосць». Зносіць. А праз пэўны час з Расіі ці Украіны прыязджае ўладальнік, так бы мовіць, нерухомасці, і ўздымае лямант: груба парушылі яго правы ўласніка! І падае ў суд, які нярэдка становіцца на яго бок. Ужо па некалькіх справах рашэнні былі прынятыя не на карысць сельсаветаў. Таму трэба быць вельмі абачлівымі пры зносе нязай і занядбанай хаціны з праваленым дахам. У любым выпадку неабходна дзейнічаць па законе.

**Гутарыў Леанід ЛАХМАНЕНКА.**



Старшыня Чысцінскага сельскага Савета Анатоль ПЯЦЮШЫК і намесніца загадчыка садка № 2 Ала БАГДАНАВА.

НА СВАЕ ВОЧЫ

# ЧЫСЦЬ І ЧЫСЦІНЯ

**Гэта не першы наш прыезд у Чысць. І зноў адзначаем змены да лепшага ў добраўпарадкаванні тэрыторыі. Чысць расце, прыгажэе і ўяўляе сабой утульнае, з добрай інфраструктурай і сацыяльнай сферай месца жыхарства.**

Сёння ў самім пасёлку жыве больш за 6000 чалавек. Яшчэ 240 жыхароў — у дзвюх суседніх вёсках. Відаць, улічваючы патэнцыял пасёлка, да сельсавета нядаўна далучылі вёску Раёўка з насельніцтвам каля 600 чалавек. Для іх паслуг два дзіцячыя садкі (адзін з іх прызнаваўся лепшым у вобласці і краіне сярод сельскіх дзіцячых дашкольных устаноў). Ёсць школа мастацтваў, дзе вучаць музыцы, маляванню, харэаграфіі і г.д.

Задаволены людзі сваёй аптэкай, паліклінікай, бальніцай, якія ўкамплектаваны кваліфікаваным персаналам і абсталяваны сучаснай тэхнікай. Старшыня Чысцінскага сельскага Савета дэпутатаў Анатоль Пяцюшык у сувязі з гэтым расказаў цікавую гісторыю на медыцынскую тэму. Калі з-за рамонту інфекцыйнага аддзялення ў маладзечанскай бальніцы было вырашана часова размясціць яго ў чысцінскай, то частка насельніцтва гэтую навіну сустрэла ў штыкі: збіраліся сходы, пісалі петыцыі. Але потым агледзеліся, прызвычаіліся і... пачалі патрабаваць, каб інфекцыйнае аддзяленне засталося ў Чысці.

## Малады і кампактны

— Чалавеку штo патрэбна ў першую чаргу? Прыстойная і надзейная, па доўгатэрміновую перспектыву, праца з нармальнай зарплатай, камфартабельнае жыллё і спрыяльнае навакольнае асяроддзе. Усё гэта ёсць у Чысці. Але галоўнае — усё ж праца, бо яна, нібы якар, замацоўвае чалавека і яго сям'ю на месцы, стымулюе добраўпарадкаваць і ўпрыгожваць тэрыторыю пражывання, — разважае Анатоль Пяцюшык. І працягвае: — Наш пасёлак кампактны. І вельмі малады — быў заснаваны ў 1955 годзе. Пачатак не абяцаў яму бліскучай будучыні. Узводзіўся ён побач з торфараспрацоўкамі. І калі б тады нехта сказаў, што гэтае паселішча стане ўзорам для іншых сельскіх населеных пунктаў, фантазёра ўзнялі б на смех. Асновай для развіцця нашай тэрыторыі стала «Забудова».

І сапраўды, лёс пераважнай большасці жыхароў пасёлка цесна звязаны з гэтым горадаўтваральным прадпрыемствам. Яшчэ ў 1990-м па рашэнні раённага Савета дэпутатаў на базе Чысцінскай асацыяцыі па жыллёвым будаўніцтве было створана адкрытае акцыянернае таварыства «Забудова». 4 жніўня 2010 года яго перайменавалі ў ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «Забудова», якая ўключае ў сябе чатыры сучасныя заводы па выпуску поўнага камплекта матэрыялаў, вырабаў і канструкцый для ўзвядзення энергаэфектыўнага жылля. «Забудову» сёння ведаюць далёка за межамі краіны: яе гандлёвыя прадстаўніцтвы дзейнічаюць у Маскве, Санкт-Пецярбургу, Смаленску, Мурманску, Стаўрапалі і іншых расійскіх гарадах. Зразумела, кіраўніцтва «Забудовы» заўсёды падтрымлівала і падтрымлівае высілкі сельскай улады па навядзенні і падтрыманні парадку.

## Далей ад правінцыйнасці

— Нашаму Савету ў пэўным сэнсе пашанцавала, што яго дэпутатам ужо чацвёртае скліканне запар выбіраецца Святлана Купчык. Выдатны спецыяліст, здольны арганізатар, у многім дзякуючы ёй намагиннем Чысць зараз выглядае так, як выглядае. Увогуле, тое, што вы бачыце, — сумесны вынік работы сельвыканкама, дэпутатаў і работнікаў жыллёва-камунальнай гаспадаркі. З імі разам мы наладзілі скошванне травы, абрэзку веток, спілоўванне старых, ужо небяспечных дрэў. Бо інакш населены пункт будзе выглядаць запушчаным, непрывабным, правінцыйным. Напрыклад, два касцы — адзін ад сельсавета, другі ад службы ЖКГ спраўляюцца са скошваннем травы, — гаворыць Анатоль Пяцюшык.



Старшыня Маладзечанскага райсавета Віктар НЕВЯРОВІЧ і кіраўнік справамі Чысцінскага сельсавета Таццяна МАРОЗАВА.

Паводле слоў дэпутата Святланы Купчык, майстра філіяла ўпраўлення камунальнага абслугоўвання, сакрэт чысціні ў пасёлку просты: трэба любаць тыя мясціны, дзе ты жывеш і працуеш. І дапамагаць прывіваць гэтую любоў мясцовым жыхарам.

— Вядома, чыста там, дзе не смецяць. Разам са старшынёй Савета раз на тыдзень робім аб'езд тэрыторыі. Асаблівая ўвага — прыватнаму сектару, дзе нярэдка можна ўбачыць няскошаную траву, пустазелле ўздоўж агародкаў, непрыбраныя рэшткі будаўнічых матэрыялаў... Аднак мэта аб'ездаў не толькі ў тым заключаецца, каб убачыць недахопы. Спакойна гутарым з гаспадарамі сядзібы, пераконваем у неабходнасці сачыць за парадкам на тэрыторыі. Зразумела, аднымі размовамі ці выдачай адпаведных прадпісанняў прадстаўнікі Савета не абмяжоўваюцца. Наладзілі восенскі рэгулярны рух па прыватным сектары трактара, які збірае загадзя вынесеныя мяхі з адходамі і смеццем. Дзякуючы такой пастаяннай рабоце з людзьмі паступова ўдалося паконьчыць са стыхійнымі звалкамі, — кажа Святлана Рыгораўна.

Сярод даўніх і надзейных партнёраў сельсавета — мясцовая школа. Вясной, напрыклад, вучні дапамагаюць садзіць дрэвы, кусты, прыбіраць ад смецця лясныя масівы ў пасёлку і вакол яго. Хаця часам дзеці могуць і перастарацца: летась столькі нагрэбалі шышак і іголак, што на іх вываз спатрэбілася некалькі 20-тонных МАЗаў.

Школьнікі ўсё часцей уладкоўваюцца летам на працу ў чысцінскі філіял ЖКГ, іх бяруць у якасці рабочых. Працоўны дзень — 4 гадзіны. Работа не цяжкая: кветкі высаджваць, клумбы палоць, смецце прыбіраць. Карысць двайная, лічыць дэпутат. Нейкую капейку моладзь зарабіць, а галоўнае, на сабе адчуе, што значыць падтрыманне парадку і чысціні.

## Зялёніны шмат не бывае...

Хаця Чысць знаходзіцца сярод лесу — нават у самім пасёлку на кожным кроку сустракаюцца сосны і бярозы, а паветра тут свежае і насычанае пахамі палявых кветак і дрэў — у сваім штогадовым плане мерапрыемстваў па навядзенні парадку на зямлі выканкам надае вялікую ўвагу азеляненню тэрыторыі. Загадзя прадугледжваецца закладка газонаў, кветнікаў, пасадка дрэў і кустоў. Мясцовая ўлада праводзіць комплекснае добраўпарадкаванне пасёлка, што дае найбольшы эфект. З гэтай нагоды запланавана стварэнне малых архітэктурных формаў і дэкаратыўных кампазіцый, рамонт дзіцячых пляцовак, устаноўка кантэйнераў для раздзельнага збору адходаў, намечаны бягучы рамонт фасадаў асобных будынкаў, абсталяванне месца адпачынку ў лясным масіве, рамонт і ўстаноўка пяці смеццязборнікаў на аўтобусных прыпынках, аднаўленне і замена дарожных знакаў, ямачны рамонт шэрагу вуліц пасёлка і г.д.

У сельсавеце асаблівую ўвагу надаюць прыцягненню насельніцтва да азелянення двароў, уласных падворкаў. Як падкрэсліў старшыня Маладзечанскага раённага Савета дэпутатаў Віктар Невяровіч, які ў той дзень таксама завітаў у Чысць, пасёлак неадназова выходзіў пераможцам рэспубліканскага і абласнога спаборніцтваў на лепшы сельскі населены пункт па добраўпарадкаванні тэрыторыі.

**Леанід ТУГАРЫН.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**
*Маладзечанскі раён.*

ДАПАМОГА

# МОЖА ЎЗДЫХНУЦЬ НА ПОЎНЫЯ ГРУДЗІ

**У Наваполацку, як кажуць, усім горадам дапамаглі дзяўчынцы, якая з нараджэння пакутавала ад цяжкай хваробы — спынення дыхання ў сне. Па ініцыятыве старшыні гарвыканкама, члена Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай гараджане збіралі сродкі на лячэнне дзяўчынкі. І вось Паліна Мішута сёлета пойдзе ў 1 клас!**

— Напярэдадні новага навучальнага года 23 жніўня старшыня Наваполацкага гарвыканкама наведае многіх дзяцей. Мэр прыйдзе павіншаваць і Паліну. Разам са старшынёй гарвыканкама да дзіцяці прыйдуць з падарункамі і віншаваннямі лідары грамадскіх арганізацый: гарадскога Савета жанчын, «Фонду міру», «Чырвонага Крыжа». Таксама мэр наведае дзяцей з малазабеспечаных сем'яў, якім будуць уручаны сертыфікаты на набыццё неабходных школьных тавараў у крамах горада, — паведамілі ў гарвыканкаме.

А дзеці з абмежаванымі магчымасцямі, якія займаюцца ў Наваполацкай сярэдняй школе № 8, да пачатку новага навучальнага года атрымаюць выдатны падарунак — самаходную пад'ёмную прыладу для перамяшчэння на паверхах школьнага будынка.

А 26 жніўня ў гарадскім кінавідэацэнтры прадпрыемства, гарадской тэлерадыёкампаніі «Вектар» адбудзецца заключны этап гарадской акцыі «Разам у школу». Дзяцей з малазабеспечаных сем'яў і непаўнагетніх, якія знаходзяцца ў сацыяльным прытулку, запрасілі на дзіцячае свята. Юных гараджан чакаюць забаўляльная праграма, салодкі стол і прагляд мультфільма ў 3D-зале.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# ФІРМА ВЕНІКАЎ НЕ ВЯЖА

Іх вырабляюць у дзіцячым лагеры працы і адпачынку «Орлік»

***Лепшы лекар у вёсцы — лазня. А якая ж лазня без добрага веніка? У кожнага — свае ўласцівасці. Напрыклад, бярозавы распаўсюджвае фітанцыды, добра ачышчае скуру, загойвае раны і рубцы.***

— Найлепш нарыхтоўваць сыравіну ў чэрвені — ліпені, — як сапраўдны спецыяліст, сцвярджае вучань Бучацінскай сярэдняй школы Капыльскага раёна Дзмітрый Кашырын. — Рабіць гэта трэба ў сухое надвор'е, інакш лісце пацямнее і будзе асыпацца.

Дзмітрый адпачываў у лагеры ў першую змену. За 19 дзён хлопец і яго сябры звязалі па 200 венікаў і зарабілі звыш 400 тыс. рублёў кожны. Прадукцыю, згодна з дагаворам, выхаванцы здалі ў Орлікаўскае лясніцтва, якое выдзеліла дзецям спецыяльны ўчастак для нарыхтоўкі сыравіны.

Увогуле ж у Мінскай вобласці гэтым летам функцыянавала звыш 140 лагераў працы і адпачынку для падлеткаў, у мінулым годзе іх было 86.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# ТВОРЧЫ ПАЧАТАК

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*



Унесці свой уклад у справу паляпшэння выгляду горада прапанавалі дзелавым людзям. Адгукнуліся многія. Спачатку гаворка вялася пра некалькі так званых «літаратурных» ліхтароў. Мелася на ўвазе прысвяціць іх творам і асобе пісьменніка Мікалая Гогаля, чыё імя носіць адна з цэнтральных вуліц горада. Мастакі і скульптары ўзяліся за эскізы, майстры-кавалі — за інструмент. Цікава, што ў гарвыканкаме нават не праводзілі ніякіх папярэдніх аглядаў. Майстрам быў аказаны поўны давер. Эскізы малявалі не толькі прафесійныя мастакі, але і вучні, студэнты, неабыякавыя гараджане. Конкурс праводзілі спонсары праектаў. І нават сам мэр, аўтар ідэі, убачыў многія гатовыя вырабы ўжо на пастаменце.

Большасць металічных ліхтароў вырабілі каваль Аляксандр Чумакоў і майстэрня «Жар-птушка». Вядомы ў Брэсце па ліхтарах на вуліцы Савецкай Аляксандр Чумакоў выкаваў «літаратурныя» ліхтары. Адзін з іх мае назву «Вечары на хутары бліз Дзіканькі» і адлюстроўвае момант, калі чорцік спрабуе ўкрасці месяц з неба. Ліхтар валодае эфектам «тэатра ценяў». Увечары, калі наступае змрок і запальваецца святло, у адным з вокнаў з'яўляецца постаць знакамітай Салохі, у другім — фігура старасты вёскі Дзіканька, пана Галавы. У гэтым шэдэўры кавальскага мастацтва памерам 3 метры 40 сантыметраў перададзены гумарыстычна-містычны дух «Вечароў». Шкада, што яго не было, калі дзеля з тэатральных фестываляў «Белая вежа» быў прысвечаны творчасці Гогаля. Магчыма, нейкі з тэатраў выкарыстаў быў гэтую пляцоўку.

А літаральна днямі з'явіўся трыццаты па ліку ліхтар на матывах аповесці Гогаля — «Нос». Яго падарыў гораду асабіста Аляксандр Чумакоў. Убачыўшы гэты нос, згадаеш вышэйназваны твор Гогаля, нават калі чытаў яго гадоў 30 таму. Яшчэ адзін «літаратурны» ліхтар — «Спальванне другога тома «Мёртвых душ» Мікалая Гогаля. Кампазіцыя вельмі эфектна выглядае ў цёмны час сутак: чырвоныя «языкі» полымя напаўзаюць на рукі Майстра. Містыку, увасобленую ў метале, фінансавала кампанія «Заходняе фондавае бюро», пра што сведчыць гранітная зорка, усталяваная побач. Знакі з імёнамі спонсараў стаяць каля кожнага з ліхтароў.

Пасля ўстаноўкі першых ліхтароў справа набыла папулярнасць, з'явіліся новыя ахвотныя ўвекавечыць назву сваёй фірмы і падарыць гораду часцінку святла і творчасці. Адна з кампаній, якая фінансавала ліхтар у ліку першых, цяпер палічыла яго занадта сціплым у мастацкім сэнсе і выказала намер замяніць яго на новы. Такому душэўнаму і фінансаваму парыву ніхто, вядома, не будзе пярэчыць. А знакаміта ў краіне прадпрыемства ўжо аб'явіла творчы конкурс. Тым больш што прыклады арыгінальнага падыходу не проста ёсць — іх цэлая вуліца.

Вельмі цікавая работа кавальскай майстэрні «Жар-птушка» стаіць на скрыжаванні з вуліцай Куйбышава. Ліхтар у выглядзе карункавай сукенкі з каванага металу з капялюшыкам-абажурам чымсьці нагадвае валагодскія карункі. Так швейная фірма «Burvin» нагадала гараджанам, што яна выпускае прыгожую жаночую вопратку. Другі вытворца адзення «Панда» замовіла ліхтар у выглядзе кампазіцыі, у цэнтры якой стаіць жалезная швейная машынка. І цяпер за гэту машынку сядае ледзь не кожны другі, каб сфатаграфавацца на памяць.

Звяртае на сябе ўвагу ліхтар Брэсцкага мясакамбіната ў выглядзе старадаўняга гадзінніка як сімвала няхменлівасці і ўстойлівасці. Іншыя ліхтары нясуць у сабе тэматыку высокіх тэхналогій і рамантыку марскіх падарожжаў, прыроды і музыкі. Нікога, пэўна, не пакіне абыякавым Маленькі прынц з яго вечнай Ружай. Ёсць ліхтары, зробленыя ў класічнай еўрапейскай традыцыі. А заяўкі ад прадпрыемстваў працягваюць паступаць. І вось ужо гарвыканкамам адведзена 10 пляцовак для новых ліхтароў. Думаю, у хуткім часе майстры-кавалі парадуюць нас новымі творамі.



...На жаль, няўмольны гістарычны лёс амаль нічога не пакінуў ад старажытнага Бярэсця, якое летапісцы параўноўвалі з Кракавам. Горад, фактычна ўзведзены на новым месцы, павінен ствараць новыя славутасці, якія паступова станучь яго адметнасцю, яго душой. Ліхтары — адзін з крокаў на гэтым шляху.

**Фота Валерыя КАРАЛЯ.**

# «МАЛІНАВЫ РАЙ»...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)*

Святлана-малодшая таксама задаволена малінавым бізнесам. Яна не толькі працуе на ўчастку, але ўжо ездзіла ў Слаўгарад прадаваць ягаду, прычым справілася з задачай паспяхова.

Між тым, бацькі Святланы ўсё больш задумваюцца пра рэалізацыю ягад. Гіжэнка — гэта глыбінка, тры дзясяткі кіламетраў ад Слаўгарада, да абласнога цэнтра тым больш далёка, таму патрэбны новы праект.

— Прадукт хутка псуецца, таму неабходна набыць устаноўку для хуткага замарожвання, — гаворыць Святлана і Міхаіл.— Таксама не перашкодзіў бы і свой транспарт для дастаўкі. Атрымаецца ці не — паглядзім. Але ўжо і цяпер мы маем вялікае задавальненне ад уласнай працы.

## Ініцыятыва знізу

**Дырэктар мясцовага фонду развіцця сельскіх тэрыторый «Адраджэнне-Агра» Таццяна ГУРЫНА расказвае:**

— У праекце «Малінавы рай» сяляне фактычна далі ў рукі кусты маліны і парадзілі прыкласці свае веды і працу, каб зарабіць на гэтым.

Кожны ўдзельнік «Малінавага раю» пасадзіў ад адной да пяці сотак ягадных кустоў — увогуле на вёсцы будзе сотак 40. Але ў кожнага гаспадара атрымаўся свой вынік, і лепшым, самым паспяховым стаў вопыт Святланы Малашанкі і Мікалая Пуземчыка. Іншыя вырасцілі маліну ў гэтым сезоне толькі для сваіх патрэб, а не на продаж. Так, прынамсі, атрымалася і ў кіраўніка сельсавета Тамары Мельнікавай.

— На маім участку пясчаная глеба, а сёлета вельмі спякотна, так што маліны ў мяне вырасла небагата, — прызнаецца Тамара Францаўна.

У Гіжэнскім сельсавеце «Малінавы рай» — далёка не першы праект. Тут рабілі для прыватных гаспадарок добрую пашу, стварылі дзіцячую пляцоўку, цяпер будуць набываць абсталяванне для спартыўнай залы. Гэта ўвогуле называецца тэрытарыяльным падыходам да развіцця вёскі. У Гіжэнскім сельсавеце ў агульнай справе задзейнічаны тры вёскі: цэнтральная Гіжэнка, Целяшы і Бярозаўка, дзе ўжо створаны і працуюць партнёрскія камітэты.

— Мы гатовы падтрымаць любую ініцыятыву, якая ідзе да людзей, — кажа Таццяна Гурына на імя «Адраджэння-Агра». — Увогуле ва ўсіх нашых сумесных праектах ініцыятыва ідзе знізу. Частку грошай мы забяспечваем, частку — самі сяляне. Калі яны хочуць, то ў супрацоўніцтве з мясцовай уладай мы дапамагаем дасягнуць выніку. Гэта і ёсць сапраўдныя прыклады самакіравання, калі людзі хочуць дабіцца вынікаў самі, а дапамагаюць ім улады і фонды.

Хаця Тамара Мельнікава, як рэаліст, папярэджвае, што не ўсё адразу і само сабой у іх атрымлівалася. Людзей, паводле слоў старшыні сельскага Савета, даводзілася пераконваць і ўгаворваць.

— Ведаеце, ёсць у нас такое: маўляў, вы нам дайце, а мы потым паглядзім, — расказвае Тамара Францаўна. — Ва ўсякім разе, да прапаноў, якімі фонд нас бударажыў, жыхары спачатку ставіліся з недаверам. А мы казалі, што трэба карыстацца перавагамі свайго сельскага ладу жыцця, вырошчваць чыстую прадукцыю і прадаваць. Ну чаму ў Шклове з агуркамі атрымліваецца, а ў нас не можа атрымацца з малінай?

Ужо цяпер, калі ёсць першыя вынікі, да праекта маглі б далучыцца і больш людзей, лічаць у сельсавеце. Калі на наступны год будзе добры ўраджай, дбайным гаспадарам разам можна арганізаваць яго рэалізацыю — хаця б на Быхаўскі кансервавы завод.

— Нам важна само жаданне людзей навучыцца гаспадарнічаць і атрымаць вынік, — каментуе Таццяна Гурына. — Калі ён ёсць — паляпшаецца якасць жыцця. Але далей гэта становіцца яшчэ і добрым прыкладам для іншых вяскоўцаў, ініцыятыва пашыраецца, вёска мяняе аблічча і жыве ўжо іншым, лепшым жыццём.

**Фота аўтара.**

*Слаўгарадскі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ. Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў.
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыя газеты «Звязда».
**Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**
**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.**
Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.
АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 44 12;
**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by
**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**
**Тыраж 22.974. Нумар падпісаны ў 19.30 20 жніўня 2013 года.**

■ Фінансавы выдатнік

# ЯК ВЫБРАЦЬ ДЭПАЗІТ?

**У мінулы раз мы закранaлі тэму выгадных крэдытаў. Сёння паспрабуем разабрацца з такім паняццем, як «банкаўскія ўклады», ці «дэпазіты». Уявім, што ў вас ёсць лішнія грошы, якія вы сумленна назапасілі. Пакласці іх пад матрац неяк недальнабачна і непрактычна. Інфляцыя (злосны вораг усіх зберажэнняў) не спіць і абясцэньвае грошы з вялікім задавальненнем. Можна, вядома, купіць залаты злітак і сесці на яго, але нават золата мае такую шкодную ўласцівасць, як зменлівасць цаны. Тым больш, каб купіць золата, патрэбна занадта шмат грошай. Калі сума вашых зберажэнняў вызначаецца не ракфелераўскімі лічбамі, лепш пакладзіце грошы на дэпазіт (у нашай краіне пакуль што амаль адзіны спосаб прымусіць грошы «працаваць»).**

У якасці прыкладу возьмем умоўныя 5 мільёнаў рублёў. А цяпер будзем думаць, на які дэпазіт іх лепш за ўсё пакласці. Пачнём з кароткатэрміновых. На тры месяцы розныя банкі прапануюць уклады з працэнтнымі стаўкамі ад 15 да 39 працэнтаў. (Загадзя дамовімся, што мы разглядаем прапановы толькі з фіксаванай стаўкай). Але, акрамя стаўкі, варта звярнуць увагу і на шматлікія незразумелыя і малавядомыя паняцці, якія таксама суправаджаюць апісанне фінансавага прадукту. Капіталізацыя — гэта далучэнне да сумы дзеючага капіталу нормы прыбытку працэнта. Іншымі словамі, капіталізацыя азначае, што працэнты па вашым дэпазіце, якія налічваюцца кожны месяц, залічваюцца ў суму дэпазіту і працэнт ў наступным месяцы разлічваецца ўжо з большай сумы. Эфектыўная стаўка — рэальная стаўка, якая ўлічвае ўсе ўмовы дэпазіту. У тых укладах, дзе ёсць капіталізацыя, заяўленая і эфектыўная стаўка будзе адрозніваццa, бо па факце даход будзе большым, чым па заяўленым працэнце з-за залічэння ў суму дэпазіту ўжо зробленых працэнтаў.

Аднак больш прывабным, на мой погляд, у кароткатэрміновых укладах (на 3, на 6 месяцаў) з'яўляецца вялікая стаўка без капіталізацыі (наўрад ці хто-небудзь з банкаў будзе прапаноўваць і адно і другое аднaчасова). Растлумачу чаму: на невялікі тэрмін стаўка, скажам, у 39%, будзе даваць большы даход, чым стаўка ў 35% з капіталізацыяй, бо ў апошнім выпадку эфектыўная стаўка складзе каля 36% (на тры месяцы) ці 38% (на 6 месяцаў), а ў першым — 39%.

Іншая справа, калі мы пакладзём свае 5 мільёнаў, скажам, на 1 год. Лічбы тады зменяцца. Дэпазіт з капіталізацыяй працэнтаў пакажацца больш выгадным. Мяркуйце самі: эфектыўная стаўка таго самага 35-працэнтнага дэпазіту атрымаецца роўнай каля 41%, а ў 39-працэнтнага застанецца зноў на ўзроўні 39%. І чым большым будзе тэрмін, на які вы паклалі свае грошы, тым больш прыбытковым акажацца дэпазіт. Адзінае, хачу папярэдзіць, што ўсе гэтыя разлікі вядуцца мною ідэалізавана, як у падручніку фізікі, а ў жыцці ўсё можа аказацца зусім іншым. Каб не прагадаць, трэба быць вельмі пільным і ў кожным асобным выпадку пралічваць усе перавагі і недахопы. Банкі могуць заклікаць вас вельмі выгаднымі ўмовамі, але насамрэч прапанаваць нешта калі не адваротнае, то не такое прывабнае. Сачыце за тым, каб з вас не бралі нейкай дадатковай платы за што-небудзь. Абавязкова спытайце ў банкаўскага кансультанта, з якім будзеце размаўляць, пра такія рэчы, як:

– магчымасць частковага зняцця сродкаў з укладу, асабліва без камісій, змяненняў стаўкі і гэтак далей (інакш вы не зможаце, калі вам спатрэбіцца, зняць пэўную суму);

– магчымасць папаўнення ўкладу;

– умовы датэрміновага скасавання дагавора (звычайна пераразлік у такім выпадку ідзе па вельмі нізкай стаўцы — напрыклад, 0,01% ці 0,5%, а бывае і так, што за пэўны перыяд пераразлік увогуле не праводзіцца);

– сума дадатковага ўзносу;

– умовы працягу дзеяння ўкладу (у асноўным пралангацыя ідзе аўтаматычна, калі вы не забралі з рахунку грошы, але будзьце пільнымі, бо некаторыя ўмовы могуць змяніцца, а вам працягнуць дэпазіт на старых, менш выгадных, умовах).

Трэба ўважліва вывучаць усе ўмовы ўкладу, тады вы зможаце знайсці найбольш выгадны для сябе варыянт.

***

**Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефоне 8 017 292 38 02.**

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ**

■

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

**24 сентября 2013 года проводит 2А открытый аукцион по продаже имущества, а также 1А повторный аукцион от 28 июня 2013 года**

| Номера лотов | Наименование имущества | Износ, % | Начальная цена торгов, бел. руб. | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 4 | Станок для заточки круглых плашек, модель МФ-27А | 39,5 | 2 500 000 | 250 000 |
| 5 | Станок для заточки круглых плашек, модель МФ-27А | 39,6 | 4 900 000 | 490 000 |
| 7 | Станок токарно-револьверный, модель 1К341 | 39,6 | 20 300 000 | 2 030 000 |
| 8 | Станок фрезерный, модель 6Р12 | 54,8 | 21 900 000 | 2 190 000 |
| 18 | Домкрат автомобильный | 99,5 | 38 000 | 3 800 |
| 20 | Домкрат гидравлический, ДГ-30 ОСТ 133-2626-75 | 100 | 1 950 000 | 195 000 |
| 21 | Домкрат гидравлический, ДГ-30 ОСТ 133-2626-75 | 100 | 1 950 000 | 195 000 |
| 22 | Домкрат гидравлический | 100 | 920 000 | 92 000 |
| 23 | Домкрат гидравлический | 100 | 920 000 | 92 000 |
| 24 | Домкрат гидравлический | 100 | 1 200 000 | 120 000 |
| 31 | Прибор 134 Н | 52,9 | 9 400 000 | 940 000 |
| 32 | Противопожарная колонка КПА | 62,3 | 2 350 000 | 235 000 |
| 33 | Строп специальный АС 847000 | 54,2 | 950 000 | 95 000 |
| 39 | Машина протирочно-резательная МПР-350М | 100 | 500 000 | 50 000 |
| 40 | Вытяжка (вентотсос) | 100 | 300 000 | 30 000 |

**Адрес нахождения имущества: г. Минск, ул. Карвата, 88.**

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж 24 сентября **2013 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 19 сентября 2013 года**.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи **24 сентября 2013 г.**

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней, нерезиденты Республики Беларусь в течение **10**-ти банковских дней со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**.

**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81.**

**Наш адрес в интернете: www.belspeckontrakt.by.**

## Управляющий в производстве по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) ООО «Центр правовых услуг» проводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества Общества с ограниченной ответственностью «Элиофеста»:

| № лота | Наименование имущества | Ед. изм. | Кол-во | Начальная цена предмета торгов | Сумма шага аукциона в размере 5%, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальное строение с инвентарным номером 100/С-55524, столярный цех, общей площадью 216,6 кв.м, расположенное по адресу: г. Брест, ул. Пушкинская, 151 (в перспективе снос данного объекта) | шт. | 1 | 1141347200 | 57067360 |
| | СТОИМОСТЬ 1 ЛОТА | | | 1141347200 | 57067360 |

**Повторный аукцион состоится 06 сентября 2013 года в 10.00 по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203.**

Заявления на участие в аукционе с приложением копий свидетельств о государственной регистрации, доверенностей, выданных представителю (для юридических лиц и ИП), или копий паспортов (для физических лиц), заверенных банком документов, подтверждающих внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет ООО «Элиофеста», принимаются по **05 сентября 2013 года** до 17.00 по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203 или по факсу 80162-33-93-88.

Шаг аукциона равен пяти процентам от начальной цены имущества. Начальная цена установлена без НДС. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 7 (семи) дней с даты проведения торгов. Победитель аукциона обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов. Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением торгов в части оплаты объявления о проведении торгов.

Размер задатка для участия в аукционе составляет 10% от начальной цены имущества и перечисляется на расчетный счет ООО «Элиофеста» № 3012151730011 в ОАО «Паритетбанк», г. Минск, МФО 153001782, УНП 290964168 в срок до **05 сентября 2013 года** до 17.00.

Победителем аукциона признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за лот.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Результаты по проведению торгов оформляются протоколами.

Сведения об организаторе торгов: Общество с ограниченной ответственностью «Центр правовых услуг», юридический адрес: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А офис 203, контактные телефоны: 80162-33-93-88, 8029-802-80-00.

Сведения о продавце: Общество с ограниченной ответственностью «Элиофеста», юридический адрес: г. Брест, ул. Задворская, 4, контактные телефоны: 80162-33-93-88, 8029-802-80-00.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения при продаже имущества должника на аукционе – в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203, тел./факс 80162-33-93-88.

К сведению акционеров

УНН 600075003

## ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат»

В соответствии с решением Общего собрания акционеров (протокол № 24 от 29 марта 2013 года) в июле произведена выплата дивидендов акционерам ОАО по результатам работы за 2012 год в установленные собранием сроки через филиалы ОАО «АСБ Беларусбанк» и ОАО «Белагропромбанк» по Республике Беларусь, а также почтовыми переводами.

Справки по тел. (8 01795) 45 3 28.

*Дирекция, Наблюдательный Совет ОАО «Слуцкий сахарорафинадный комбинат».*

БЕЛАРУСБАНК

**ОАО «АСБ Беларусбанк»**

информирует о продлении срока размещения облигаций банка на предъявителя для физических лиц 143-144 выпусков, номинированных в белорусских рублях, по 28.02.2014.

Изменения в эмиссионные документы указанных выпусков зарегистрированы Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь 15.08.2013.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013 г, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.*

## Продаж залатых і сярэбраных зліткаў

вырас у Беларусі ў ліпені 2013 года ў параўнанні з чэрвенем, сведчаць статыстычныя даныя Нацбанка, паведамляе БЕЛТА. У ліпені Нацбанк рэалізаваў залатыя мерныя злiткі вагой 24,5 кг супраць 22,4 кг у чэрвені. Назад было выкуплена 8,1 кг золата (у чэрвені — 11,3 кг). Сярэбраных зліткаў было рэалізавана Нацбанкам за ліпень 40,6 кг, за чэрвень — 37,8 кг. Назад выкуплена 8,4 кг серабра (у чэрвені — 900 г).

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении 26 сентября 2013 года повторных торгов по продаже имущества ЗАО «Селектпроминвест»

| | |
|---|---|
| **Предмет торгов (наименование, назначение, состав продаваемого имущества)** | Здание цеха изготовления мебели общей площадью 2 741 кв.м, инвентарный номер 613/С-6216 (назначение: здание нежилое, состав: здание двухэтажного кирпичного цеха изготовления мебели, две пристройки, подвал; огороженная территория 1,5 га; асфальтовое покрытие; артезианская скважина) |
| **Местонахождение продаваемого имущества** | Минская область, Крупский район, г.п. Бобр, ул. Горная, д. 2 |
| **Сведения о продавце** | ЗАО «Селектпроминвест», ул. 2-я Шестая линия, 11-11, г. Минск, телефон (017) 292-15-74 |
| **Сведения об организаторе торгов** | УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск, телефон (017) 327-48-36 |
| **Начальная цена предмета торгов (с НДС)** | 1 296 000 000 белорусских рублей |
| **Сумма задатка** | 130 000 000 белорусских рублей |

Торги проходят в форме открытого аукциона на повышение начальной цены.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ЗАО «Селектпроминвест», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона, а также предоставившие организатору торгов в установленный срок следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию документа, подтверждающего внесение задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583.

Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену за продаваемое имущество. Наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах аукциона и включает НДС. Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) подписывается сторонами в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона.

Затраты на организацию и проведение аукциона возмещает победитель торгов (покупатель).

Торги проводятся **26 сентября 2013 года в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 22.08.2013 по 24.09.2013 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

**Телефоны для справок: (017)327-48-36, (017) 292-15-74.**

# ЖЫЛЛЁВАЯ НЕРУХОМАСЦЬ СТАЛІЦЫ ПРАЦЯГВАЕ СУР'ЁЗНА ДАРАЖЭЦЬ

**Сярэдні кошт «квадрата» ў кватэрах тыпавых спажывецкіх якасцяў на другасным рынку нерухомасці Мінска дасягнуў у ліпені абсалютнага максімуму за апошнія чатыры гады, паведамляюць аналітыкі групы кампаній «Твая сталіца».**

Спецыялісты адзначаюць, што ў Мінску цэннік квадратнага метра сёлета ў ліпені дасягнуў 1562 долараў. У параўнанні са здзелкамі, заключанымі ў студзені, рост склаў 22,2%. На аднапакаёвыя кватэры цэннікі павялічыліся на 24,3% да 1698 долараў за 1 кв. м; на двухпакаёвую на 12,1% да 1432; на трохпакаёвую на 16,2% да 1387 долараў.

Папярэдне зроблены рамонт і наяўнасць мэблі прыплюсоўвалі да кошту рэалізаваных у ліпені кватэр у сярэднім 11%. Так, аднапакаёвыя кватэры прадаваліся прыкладна на 123 USD за 1 кв. м даражэй за кватэры тыпавых спажывецкіх якасцяў, двухпакаёвыя — на 293 долары, а трохпакаёвыя — на 347 долараў.

Калі ў першыя месяцы 2013-га сярэдні тэмп росту цэн на першасным рынку складаў 3,4%, то з мая па ліпень гэты паказчык знаходзіцца на ўзроўні 1,6%, падкрэсліваюць аналітыкі кампаніі. Кошт жылля эканом-класа на першасным рынку ў ліпені павялічыўся да 1.424 долараў за «квадрат» (на 20,1% больш, чым у студзені 2013 года); бізнес-класа — да 1606 (на 13,6% больш); эліт-класа — да 2462 долараў (на 8,3% больш). Такім чынам, сярэднеўзважаны кошт сталічнага жылля ў ліпені гэтага года склаў 1615 долараў за квадратны метр, што на 14,7% больш, чым у студзені 2013 года.

Кіраўнік аддзела групы кампаній «Твая сталіца» Святлана Кудзелка асноўнымі прычынамі існуючага росту цэн на другасным рынку жылля тлумачыць, «па-першае, зніжэннем агульнага аб'ёму прапановы, а па-другое, павелічэннем даступнасці насельніцтва да крэдытных сродкаў банкаў. Немалаважным з'яўляецца таксама агульная тэндэнцыя павышэння якасці прапанаваных на рынку кватэр. Прычым пакупнікі падтрымліваюць гэты трэнд і гатовы плаціць больш за добры стан кватэр і ўбудаванай мэблі. Таксама нельга забываць і пра агульнае павышэнне цэн у сталіцы, у тым ліку і на жыллёвую нерухомасць, якая даражэе як у рублёвым, так і ў доларавым эквіваленце.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

### ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 2** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | каплеструйные принтеры Willet-405, количеством 10 шт. |
| **Местонахождение объекта** | г. Гродно, ул. Орджоникидзе, 18 |
| **Начальная цена продажи** | 47 539 200 (сорок семь миллионов пятьсот тридцать девять тысяч двести) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 4 753 920 (четыре миллиона семьсот пятьдесят три тысячи девятьсот двадцать) белорусских рублей |
| **ЛОТ 3** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | - стол стоматологический СС5;<br>- стоматологическое кресло Chiradent ELM-1;<br>- стоматологическая установка Chiradent 652-C1. |
| **Местонахождение объекта** | г. Гродно, ул. Орджоникидзе, 18 |
| **Начальная цена продажи** | 23 750 400 (двадцать три миллиона семьсот пятьдесят тысяч четыреста) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 2 375 040 (два миллиона триста семьдесят пять тысяч сорок) белорусских рублей |
| **ЛОТ 4** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | вилочный электропогрузчик Nissan, 3-опорный, грузоподъемностью 1,6 тонны, 2002 г.в. 4-секционный гидравлический распределитель |
| **Местонахождение объекта** | г. Гродно, ул. Орджоникидзе, 18 |
| **Начальная цена продажи** | 42 720 000 (сорок два миллиона семьсот двадцать тысяч) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 4 272 000 (четыре миллиона двести семьдесят две тысячи) белорусских рублей |
| **ЛОТ 5** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | автомобиль бортовой ЗИЛ 431410, грузоподъемностью 5,5 тонны, 1991 г.в., газ-бензин, пробег 280 000 км |
| **Местонахождение объекта** | г. Гродно, ул. Орджоникидзе, 18 |
| **Начальная цена продажи** | 20 064 000 (двадцать миллионов шестьдесят четыре тысячи) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 2 006 400 (два миллиона шесть тысяч четыреста) белорусских рублей |
| **ЛОТ 6** | |
| **Наименование и краткая характеристика объекта** | автомобиль Форд Мондео 0650 АА-4, универсал, 1993 г.в. 1,8i, черный, пробег 680 000 км |
| **Местонахождение объекта** | г. Гродно, ул. Орджоникидзе, 18 |
| **Начальная цена продажи** | 16 608 000 (шестнадцать миллионов шестьсот восемь тысяч) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 1 660 800 (один миллион шестьсот шестьдесят тысяч восемьсот) белорусских рублей |
| **Продавец** | ОАО «Гродненская табачная фабрика «Неман», г. Гродно, ул. Орджоникидзе, 18 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32 |
| **Условия аукциона** | аукцион без условий |
| **Условия оплаты** | по договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | Р/с 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 3 сентября 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами: заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица; копии учредительных документов;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицам – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений 28 августа 2013 г. до 15.00.**

***Телефон для справок: 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». Дополнительная информация: www.ino.by***

УНН 300000398

*Уважаемые акционеры открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»*

**29 августа 2013 года в 14.00 состоится внеочередное общее собрание акционеров**

## открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г. Витебск»

Собрание пройдет по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16, актовый зал.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. О выплате дивидендов за 2 квартал 2013 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: **г. Витебск, ул. Суворова, 16 (наблюдательный совет), время работы с 8.30 до 17.30, тел. 37 45 66.**

Регистрация участников собрания **с 13.00 до 13.45** по месту проведения собрания.

Список акционеров для участия в собрании составлен по состоянию **на 20 августа 2013 г.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества — паспорт, представителю акционера — паспорт и доверенность.

*Наблюдательный совет*

## Ликвидатор ООО «Центр правовых услуг» поводит повторный открытый аукцион по продаже недвижимого имущества Иностранного общества с ограниченной ответственностью «Истгейт форест», расположенного по адресу: Минская область, Воложинский район, Першайский сельский совет, вблизи деревни Ислачевка на земельном участке с кадастровым номером 622085000001000001 площадью 22800 кв.м находящимся на праве аренды:

| № лота | Наименование имущества | Ед. изм. | Кол-во | Начальная цена предмета (бел. руб.) | Сумма НДС 20% (бел. руб.) | Начальная цена предмета торгов с НДС (бел. руб.) | Сумма шага аукциона в размере 5% (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Капитальные строения с инвентарными номерами:<br>632/С-24385 (подкрановые пути) площадью 66,6 кв.м.<br>632/С-15295 (арочник) площадью 655,2 кв.м<br>632/С-15289 (цех по переработке мелкотоварной древесины), площадью 900,6 кв.м<br>632/С-15291 (здание конторы) площадью 62,7 кв.м<br>632/С-15348 (здание гаража на 1 автомашину) площадью 28,5 кв.м<br>632/С-15293 (инструментальный цех) площадью 89,4 кв.м<br>632/С-15297 (бытовка (баня)) площадью 34,2 кв.м<br>632/С-15299 (сушилка) площадью 41,1 кв.м | Шт. | 1 | 351459360 | 70291872 | 421751232 | 21087562 |
| | СТОИМОСТЬ 1 ЛОТА | | | 351459360 | 70291872 | 421751232 | 21087562 |

**Повторный аукцион состоится 06 сентября 2013 года в 11.00 по адресу ликвидатора: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203.**

Заявления на участие в аукционе с приложением копий свидетельств о государственной регистрации, доверенностей, выданных представителю (для юридических лиц и ИП), или копий паспортов (для физических лиц), заверенных банком документов, подтверждающих внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет ИООО «Истгейт форест», принимаются по **05 сентября 2013 года** до 17.00 по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 203 или по факсу 80162-33-93-88.

Шаг аукциона равен пяти процентам от начальной цены имущества. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 7 (семи) дней с даты проведения торгов. Победитель аукциона обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов. Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением торгов в части оплаты объявления о проведении торгов и оценки имущества, в течение 5 дней с даты проведения торгов.

Размер задатка для участия в аукционе составляет 10% от начальной цены имущества и перечисляется на расчетный счет ИООО «Истгейт форест» № 3012000056189 в ОАО «Белгазпромбанк» г. Минск, ул. Притыцкого, 60/2, код 742, УНП 490850658 в срок до **05 сентября 2013 года** до 17.00.

Победителем аукциона признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за лот.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Результаты по проведению торгов оформляются протоколами.

Сведения об организаторе торгов: Общество с ограниченной ответственностью «Центр правовых услуг», юридический адрес: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А офис 203, контактные телефоны: 80162-33-93-88, 8029-802-80-00.

Сведения о продавце: Иностранное общество с ограниченной ответственностью «Истгейт форест» г. Воложин ул. Набережная, 13, 3-3, контактные телефоны: 80162-33-93-88, 8029-802-80-00.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения при продаже имущества должника на аукционе – в любое время, но не позднее чем за пять дней до наступления даты его проведения.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 9.00 до 17.00 по адресу: 224022, г. Брест ул. Ясеневая, 20А, офис 203, тел./факс 80162-33-93-88.

# У ЦЕНЮ ЛЯСНОГА БІЗНЕСУ



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Калі выкарыстоўваеш граблі, то пакаранне заўсёды жорсткае. Апрача істотнага штрафу за варварскае збіранне грыбоў, браканьера чакае і сума ў 4 мільёны за пашкоджанне лясной падсцілкі. Гэта ледзь не тое ж самае, што пайсці ў Белавежскую пушчу і ссячы там якое дрэўца. Калі ніводнаму стварэнню не прыйдзе ў галаву апошняя ідэя, то ахвотныя знішчыць мох сустракаюцца. Вера Філіповіч, адзін з галоўных супрацоўнікаў сектара па ахове лесу, у сваёй практычнай дзейнасці сутыкалася з выпадкамі, калі грузавікі нават успамінаў не пакінулі ад лясной падсцілкі. За кожныя 3 квадратныя метры самаўпэўненым наведвальнікам давялося заплаціць касмічную суму грошай. Вось такая нешчаслівая казка.

## ЯГАДНЫ ДАЗОР

Безумоўна, колькасць грыбных бізнесменаў значна саступае ягадным. Адна справа — блукаць у пошуках рыжых шапачак, зусім іншая — проста перамяшчацца па чарнічных купінах. Вось чаму ўлетку менавіта ягадны бізнес квітнее неймаверна. Найбольш жвавыя бізнесмены за тыдзень прыносяць дахаты як мінімум 2 мільёны. Адзін чарнічны сезон — мільёнаў 8. Справа ў тым, што збіраць рукамі ягады на продаж вельмі цяжка. Мала ў каго хопіць вытрымкі гнуць спіну цэлы дзень. Збіраючы рукамі, чалавек гублее шмат часу, а вось схітрыўшы…

Тым часам дзяржаўная лясная ахова не спіць. Толькі за чэрвень і ліпень вартаўнікі лясных багаццяў зрабілі 1049 рэйдаў па ўсёй рэспубліцы. І, вядома ж, за 356 збіральнікамі ягад замацавалі статус браканьераў. Абсалютнае першынство ў гэтым плане належыць Брэсцкай вобласці. На другім месцы размясцілася Гомельская. Паводле звестак Міністэрства лясной гаспадаркі, самай «небраканьерскай» можна з упэўненасцю лічыць Магілёўскую вобласць, дзе колькасць злоўленых склала ўсяго 2 чалавекі.

«Затрыманыя заўсёды гавораць, што збіраюць ягады толькі дзеля сябе і сваёй сям'і. Але хто ведае: як там насамрэч? Мы ж па хатах не ходзім, не глядзім... Таму даводзіцца верыць, што ўсе беларусы робяць варэнне, а не ладзяць падпольны сезонны бізнес», — адзначае Вера Філіповіч, а пасля дадае: — Ніхто не гаворыць, што нельга праз дзве гадзіны зноў пайсці ў ягады. Калі ласка. Але калі чалавек перад сабой дзесяць бочак з чарніцамі кацяць, гэта ўжо наша справа. Калі ён збірае ў забароненых месцах, калі варварскім спосабам збірае, мы яго адназначна пакараем». Так, законам дазволена вынесці з лесу за адзін раз 30 кілаграмаў. Галоўнае — зрываць ягады рукамі. Самаробныя прылады ў выглядзе шуфлікаў строга забаронены. «Шморгалкі» — вось як гэтыя няхітрыя прыстасаванні называюць на Гродзеншчыне.

**«Ходзяць з гэтымі «шморгалкамі» і ўсё «шморгаюць» і «шморгаюць» чарніцы. Язык не павернецца ўжыць у дачыненні да іх слова «збіраюць». Вось і з суседняй Любчы штодзень прыязджаюць. Толькі рабочы дзень скончыцца — так адразу ж едуць да нас, у Набережную».**

Жыхары Навагрудскага раёна скардзяцца: «Ходзяць з гэтымі «шморгалкамі» і ўсё «шморгаюць» і «шморгаюць» чарніцы. Язык не павернецца ўжыць у дачыненні да іх слова «збіраюць». Вось і з суседняй Любчы штодзень прыязджаюць. Толькі рабочы дзень скончыцца — так адразу ж едуць да нас, у Набережную. Гадзіна — і поўнае вядро. Ніякіх намаганняў не патрэбна. «Шморг», «шморг»… Скваплівыя людзі цяпер пайшлі, нічога ім не шкада… І гэта ж трэба — кожны вечар прыязджаюць! Дык хто ж супраць? Нікому не шкада. Няхай бы і рвалі колькі заўгодна, але рукамі. Толькі рукамі. А то праз пяць гадоў унукам і паўлітра з'есці не назбіраеш».

Справа ў тым, што збіранне ягад металічнымі шуфлікамі лічыцца за браканьерства абсалютна справядліва. «Шморгалкі» пашкоджваюць ягаднік. Часта вырываюць яго з каранямі. Была зялёная купіна буйных сініх ягад, а засталося знішчанае месца. Голыя сцяблінкі не тое што без ягад… Без лістоў! Павырываныя, яны тырчаць карэннем уверх. І ўсё гэта паволі жоўкне, пакуль канчаткова не ператворыцца ў карычневую пляму пасярод зялёнага моху. Затое браканьеры на гэтай купіне тысяч 150 зарабілі. А вось мясцовыя жыхары абураюцца. Паміж сабой яны асуджаюць прыезджых браканьераў. Але гэта паміж сабой. Ніхто не хоча кідаць камяні ў знаёмыя агароды. Пенсіянерам шмат не трэба: хоць якую-небудзь ягаду назбіраць, каб варэнне зімою было. Можа, і замарозіць пару пакетаў. Ва ўсіх у думках толькі адно: «Унукі прыедуць».

Меры пакарання ў кожным асобным выпадку ягаднага браканьерства розныя. Вядома, ёсць прыблізныя штрафы ад 5 да 20 базавых велічынь. Ключавое слова — «прыблізныя». Сёлета можна канстатаваць і з'яўленне «льготных гаваняў» (ад 0 да 20 базавых). Чаму такая розніца? Адна справа, калі металічным шуфлікам збірае ягады стары, хворы чалавек. Вінаваты? Так, безумоўна. Але ён, няшчасны, сам згаджаецца, спалохана кажа: «Прабачце». Ведае, па чым фунт ліха… Што ж тут скажаш? Іншая справа, калі гэта злосны парушальнік. Уводзіш яго імя ў базу звестак, а там інфармацыя, што ён, прайшоўшы лес уздоўж і ўпоперак, ужо другі раз злоўлены на браканьерстве. Супрацоўнікі дзяржаўнай лясной аховы тлумачаць яму сітуацыю, а парушальнік сварыцца з імі. Не, паводле яго слоў, ён — сапраўдны анёл. Вядома ж, адразу на месцы складваюць пратакол. І вось тут «анёлу» прыходзіцца раскашэліцца: штрафы, калі пратакол накіроўваецца ў суд і віна браканьера даказваецца, вельмі высокія. Тут 20 базавых стануць самым мілым з усіх магчымых варыянтаў. Сёлета склалі 25 пратаколаў, з якіх 14 — у Віцебскай вобласці.

**Калі выкарыстоўваеш граблі, то пакаранне заўсёды жорсткае. Апрача істотнага штрафу за варварскае збіранне грыбоў, браканьера чакае і сума ў 4 мільёны за пашкоджанне лясной падсцілкі. Гэта ледзь не тое ж самае, што пайсці ў Белавежскую пушчу і ссячы там якое дрэўца.**

## ШУКАЕМ САМЫХ РАЗУМНЫХ

Асобная справа датычыцца прыватных скупшчыкаў. Не ўсе, вядома, але многія з іх забіраюць у вяскоўцаў грыбы і ягады па заніжаных цэнах. Ведаюць: бабуля не даедзе да суседняй вёскі здаць чарніцы і лісічкі ў дзяржаўную краму. Таму з'яўляецца выдатная нагода на чужым карку, але ўсё ж такі хоць крыху да грашовага раю наблізіцца. Паверце, такія ідэі ў іх галовах сядзяць цвікамі. Па абуванні простых беларусаў у лапці майстроў хапае. Вось чаму дзяржаўная лясная ахова арганізоўвае рэйды сумесна з падатковай, санітарнай службамі, а таксама ДАІ. У чэрвені і ліпені здзейснілі 130 такіх рэйдаў. Менавіта яны даюць магчымасць пракантраляваць наяўнасць адпаведных дакументаў у скупшчыкаў, выявіўшы зладзеяў.

Маем праблему: беларусы збіраюць грыбы і ягады варварскім чынам. Што далей? Каб лішні раз не расчасаць лысаму валасы, давайце максімальна звузім сітуацыю. Так, мы збіралі па-браканьерску раней, збіраем і цяпер. Так, мы ведаем, што гэта дрэнна. Калі нас зловяць на гарачым, то штраф заплацім і, безумоўна, паабяцаем у будучыні стаць бездакорнымі ў гэтым плане. А зараз галоўнае: адкуль у праблемы ногі растуць?

Чаму беларусы, трапляючы ў тую ж самую Чэхію, не бачаць нічога дрэннага ў тым, каб сарваць колькі чужых яблыкаў, якія так і глядзяць на нас цераз плот? Чаму калі нас караюць там, за мяжой, мы вельмі абураемся? Гэта ж два яблыкі! У Беларусі такое гучыць проста смешна. Абсурд. А ў далёкіх суседзяў на кожным кроку — прыватная ўласнасць, дакранацца нельга.

А лес? Хто яго гаспадар? Дзяржава. У беларускім жыцці выраз «дзяржаўная ўласнасць» мы разумеем па-свойму. Калі дзяржаўнае — то можна забраць. Калі дзяржаўнае — то няма сэнсу дагледзець, шанаваць. Дзяржаўнае — гэта і тваё, і маё. Гэта наша агульнае і нічыйнае адначасова. А яшчэ ў кожнага ёсць сваё. І сваё мы даглядаем, шануем.

Вось такая свядомасць, дакладней — яе адсутнасць. Застаецца спадзявацца: свядомасць прачнецца раней, чым на святое нікол.

**Маргарыта СІДАР.**

■ Газета «Звязда» + www.doktora.by

# ЗВЯРТАЕМСЯ ДА ЎРОЛАГА

**На пытанні наведвальнікаў сайта www.doktora.by і чытачоў газеты «Звязда» адказаў загадчык аддзялення ўралогіі №3 4-й гарадской клінічнай бальніцы г. Мінска, кандыдат медыцынскіх навук Дзмітрый МАЛАШЧЫЦКІ.**

***— У мужа на ўльтрагуку выявілі пухліну ў левай ныркі. Пухліну выдалілі. Анкалогія не пацвердзілася. На пятыя суткі ўзнялася тэмпература да 39 градусаў. Урачы гаварылі, што так трэба пасля складанай аперацыі. Спрабавалі па старым праходзе, дзе стаяў дрэнаж, вывесці трубку — не атрымалася, вывелі ў іншым месцы. Нібыта стала лягчэй. Аднак праз тры дні ноччу адкрылася крывацячэнне. Экстранная аперацыя. Выдалілі селязёнку. Пасля аперацыі прайшло 12 дзён. Тэмпература днём 36, а ўвечары 37,4. Цячэ ў дрэнаж вадкасць у адным і тым жа аб'ёме. Урачы сказалі, што гэта свішч утварыўся. Кропельніцы, вабэнзім, свечкі «Генферон», і ўсё. Кажуць, першы выпадак такі. Што рабіць? Прасілі, каб перавялі ў 4-ю бальніцу, але нам адмовілі. Муж ужо другі месяц знаходзіцца ў 1-й бальніцы. Урачы кажуць, што робяць усё неабходнае. Што нам рабіць? Пражываем у Мінску, але прапісаны ў Заслаўі, а ў Мінску абслугоўваемся па дазволе…***

— Па прадастаўленай інфармацыі я магу меркаваць, што размова ідзе аб рэзекцыі (выдаленне часткі) ныркі з-за пухліны. Аперацыя сама па сабе з'яўляецца досыць складанай, і пасляаперацыйны перыяд можа працякаць не заўсёды гладка і так, як хацелася б пацыенту. Таму падобныя праблемы могуць мець месца ў пасляаперацыйны перыяд, і ўсё павінна вырашацца індывідуальна. Каб даць вам больш дэталёвы адказ, патрэбна азнаёміцца з медыцынскай дакументацыяй. 4-я клініка не спецыялізуецца на лячэнні анкалагічных хворых.

***— Мне 45 гадоў. Пасля ночы з жанчынай, якая на 4-м месяцы цяжарнасці, з'явіўся сып па целе, потым у сперме заўважыў кроў. Праз два тыдні колькасць крыві ў сперме павялічылася. Уролаг не выявіў змяненняў у наднырачніках і прастаце. Жанчыне, з якой я меў зносіны, прапісалі амаксіклаў і ністацін. Пачаў прымаць ністацін, сып прайшоў, але ў сперме стала больш крыві, баляць яечкі. Здаў аналізы, урач ніякіх адхіленняў не знайшоў.***

— Сып, які з'явіўся на целе, хутчэй за ўсё, з уралагічнымі захворваннямі не звязаны. З гэтым пытаннем неабходна звярнуцца спачатку да тэрапеўта. А з'яўленне крыві ў сперме, як правіла, служыць прыкметай такога захворвання, як везікуліт — гэта запаленчы працэс у семявых пузырках яечкаў. Лечыцца захворванне прыкладна па той жа схеме, што і хранічны прастатыт. Схему вам павінен падабраць уролаг.

***— Мне 28 гадоў. Пасля палавога акта з'явіўся чырвоны сып, месцамі язвачкі, якія лупяцца. Сверб, смыленне. Мазаў клатрымазолам пару дзён і піў аднаразова флуканазол 150 мг. Сверб і язвачкі знікалі, але дробны чырвоны сып заставаўся. Пры чарговым палавым кантакце ўсё паўтараецца зноў. Агульны і біяхімічны аналізы крыві ў норме. 1,5 года таму былі падобныя сімптомы — тады была малочніца, піў флуканазол, і ўсё праходзіла.***

— У вас маюць быць прыкметы кандыдозу, і для эфектыўнага яго лячэння неабходна абследаваць і вашу партнёрку. Інакш мае месца рэінфекцыя — паўторнае інфіцыраванне. Ваша партнёрка павінна абследавацца ў гінеколага, нават калі ў яе няма ніякіх праяў. А вам трэба падысці на прыём да ўролага. Падчас лячэння варта пазбягаць неабароненых палавых кантактаў.

***— 25 гадоў. Адчуваю смыленне напрыканцы мочаспускання. Потым стала крыху лепш, а пасля вярнулася смыленне, у мачы — крыху крыві. Што гэта можа быць?***

— Падобныя сімптомы характэрныя для цыстыту. Смыленне напрыканцы мочаспускання — для шыечнай формы цыстыту. Неабходна здаць аналіз мачы, зрабіць ультрагук мачавога пузыра для выключэння наяўнасці ў мачавым пузыры нейкіх анамалій, наяўнасці камянёў, пухлін і падабраць адпаведнае лячэнне. Пры неабходнасці — зрабіць пасеў мачы на флору і адчувальнасць да антыбактэрыяльных прэпаратаў. Лячэнне будзе прызначана згодна з вынікамі пасеву. Наогул у выпадку цыстыту лячэнне прызначаецца па так званай эмпірычнай схеме. Існуе пратакол лячэння ўралагічных хворых, згодна з якім у выпадку вострага цыстыту прызначаюцца пэўныя групы прэпаратаў, для якіх не патрабуецца вынік бактэрыялагічнага даследавання. Аднак калі не будзе выніку ад гэтага лячэння, пры пастаянным вяртанні непрыемных сімптомаў, урач звяртаецца да аналізу пасеву мачы і прызначае лячэнне ўжо на падставе выніку такога даследавання.

***— У сына ў 3 месяцы хуткасць асядання эрытрацытаў — 31. Пасеў мачы — Escherichia coli $10^5$. Прапісалі аўгменцін. Зрабілі ўльтрагук нырак і мочавыдзяляльнай сістэмы — выявілі слізь у мачы. Пасля антыбактэрыяльнай тэрапіі хуткасць асядання эрытрацытаў — 4, аналіз мачы (лейкацыты 1,25x$10^6$), пасеў мачы (Citrobacter diversus 5x$10^4$). Паўторны аналіз мачы (лейкацыты 2–3). Новы пасеў (Escherichia coli $10^8$). Прызначылі антыбіётык амікацын. Аналіз мачы (лейкацыты 1–2), пасеў мачы (Enterococ faecium $10^8$). Агульны аналіз мачы (лейкацыты 5–6, бактэрыі 2+). Пілі бісептол. Пасеў мачы (Escherichia coli $10^8$). Ультрагук нырак і мочавыдзяляльнай сістэмы ў норме. Прызначылі біятраксон. Дзіцяці 7 месяцаў. Ці прымаць нам чарговы антыбіётык? У цэлым дзіця актыўнае, ніякіх прыкмет захворвання няма.***

— Каб сабраць аналіз мачы на флору і адчувальнасць да антыбіётыкаў, умовы збору павінны быць максімальна набліжаны да стэрыльнасці. Мачу трэба правільна сабраць і не кранаць шклянку знутры рукамі. У выпадку з немаўлятамі такое забяспечыць фактычна немагчыма. Як правіла, прапануецца рабіць так. Дзіця мочыцца ў стэрыльную вату ці марлевую сурвэтку, якую адціскаюць пасля ў шклянку. Пры гэтым усё роўна будзе адчувацца занос бактэрый у шклянку, што мы і бачым па выніках вашых аналізаў. Наяўнасць розных бактэрый не стыкуецца з колькасцю лейкацытаў. Таму я мяркую, што антыбактэрыяльны прэпарат вашаму дзіцяці не патрэбны.

***— Зяць служыць па кантракце. Зараз знаходзіцца ў шпіталі з дыягназам «неспецыфічны двухбаковы орхаэпідыдыміт». Была высокая тэмпература і значнае павелічэнне яечак. Лячэнне — антыбіётыкі, трыхапол. Як гэта можа адбіцца на здароўі маёй дачкі, у якой піеланефрыт?***

— Неспецыфічны двухбаковы орхаэпідыдыміт у зяця і піеланефрыт у дачкі ніякім чынам паміж сабой не звязаны. Так што ў гэтым сэнсе пагрозы здароўю вашай дачкі няма. Аднак такое захворванне, як орхаэпідыдыміт, можа адбіцца на рэпрадуктыўнай функцыі вашага зяця. Усё залежыць ад выражанасці хваробы. Калі праявы вельмі моцныя, то можа быць нават так, што пазней сперматазоіды акажуцца няздольнымі трапіць у палавыя шляхі жанчыны, паколькі разаўецца постзапаленчы стэноз пратокаў, па якіх ідзе выкід семявай вадкасці. Можа быць проста зніжэнне функцыі яечак — іх будзе менш, яны будуць мець шмат паталагічных формаў. З другога боку, трэба мець на ўвазе, што гэтае захворванне магло развіцца ў выніку наяўнасці інфекцый, якія перадаюцца палавым шляхам. Інфекцыя можа быць не лечанай або недалечанай. І такая інфекцыя можа быць і ў вашай дачкі. Такім чынам, пасля вылечвання ваш зяць і дачка павінны абследавацца на інфекцыі, якія перадаюцца палавым шляхам. Ён — ва ўролага, яна — у гінеколага.

***— 41 год. Ад нараджэння анамалія палавых органаў. У 1999 годзе зрабілі няўдалую энтэрапохвапластыку, рэзекцыю яечнікаў у Бараўлянах. З таго моманту — пастаяннае нетрыманне мачы. Урачы спрабавалі выправіць, але нічога не атрымалася. Ці можна чым-небудзь дапамагчы?***

— Дакладна вызначыць прычыну нетрымання мачы можна толькі падчас дадатковага даследавання. Магчыма, ёсць свішч мочапалавы, пры якім будзе татальнае нетрыманне мачы. Калі ж свішча няма, і на падставе рэнтгеналагічнага даследавання можна падумаць аб слінгавай карэкцыі, якая выконваецца шляхам малаінвазіўнага ўмяшання, працягласцю не больш за 20 хвілін. Імплантуецца спецыяльная сетка, якая будзе падтрымліваць урэтру і ствараць дадатковы механізм утрымання мачы.

***— Ці можна павялічыць палавы член якім-небудзь шляхам?***

— Існуюць такія спосабы. Аднак тут трэба разбірацца індывідуальна. Можа быць, мае месца мікрапеніс — прыроджаная анамалія, або гэта вынік нейкай траўмы. А можа быць, гэта асабістая незадаволенасць памерам, што наогул не патрабуе ніякіх дзеянняў. Кансультавацца неабходна з урачом-андролагам. Існуюць розныя хірургічныя методыкі, амаль да фалапратэзавання. У нашай краіне такія аперацыі выконваюцца, хоць гэта і не надта шырока распаўсюджана.

***— Нейкі час таму падмерз у гарах. Быў цыстыт. Піў антыбіётыкі, цэфтрыяксон. Зараз дыскамфорт вярнуўся. Урач кажа, што солі ідуць… Рабіў ультрагук — камянёў няма. Што рабіць цяпер?***

— Вам неабходна здаць пасеў мачы на флору і адчувальнасць да антыбактэрыяльных прэпаратаў. Гэта дапаможа вызначыць, ці не застаўся які-небудзь мікроб пасля першага прыступу і якой адчувальнасцю ён валодае да канкрэтнага прэпарата. Можа быць, што такі прэпарат, як цэфтрыяксон, не аказаў належнага ўплыву на мікроб або курс яго прыёму быў надта кароткім. Параіць вам нейкі антыбіётык завочна будзе некарэктна.

***— Для лячэння дабраякаснай гіперплазіі прастаты прызначылі прэпарат — омнік окас. Аднак пасля 2 таблетак ужо назіраецца зніжэнне ціску, які і дагэтуль быў невысокі — 110/70. Што рабіць?***

— Прэпарат, які вам прызначылі, павінен зменшыць частату мочаспускання, выдаліць адчуванне няпоўнага мачавога пузыра. Гэта сімптаматычнае лячэнне. Калі вы такім чынам рэагуеце на омнік, трэба паспрабаваць памяняць яго ў межах групы альфаадрэнаблакатараў. Іх некалькі — доксазазін, тэразазін… І гіпатэнзіўная адчувальнасць на кожны з іх можа быць рознай. Яны ўсе зніжаюць ціск, аднак адзін прэпарат можа мацней зніжаць, а другі — менш. Трэба мець на ўвазе, што падчас моманту максімальнага дзеяння прэпарата — на працягу 3–5 гадзін — ціск будзе зніжацца, аднак пасля ён вернецца да ранейшых лічбаў. Хоць моцныя хістанні тут, сапраўды, не пажаданыя. Важна яшчэ, ці не прынялі вы дзве таблеткі ў адзін дзень, ці не парушылася такім чынам дазіроўка. Трэба паглядзець, ці не прымаеце вы якія-небудзь прэпараты па лячэнні таго ж павышанага артэрыяльнага ціску. Узаемадзеянне першых і другіх здольнае даваць такі эфект… Калі ж высветліцца, што вы не пераносіце лячэння таблеткамі, можна разгледзець варыянт хірургічнай дапамогі.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

ВОГНЕННЫЯ ВЁСКІ

# ІХ СПАСЦІГ ЛЁС ХАТЫНІ

**Каля дваццаці вёсак Капыльскага раёна спасціг лёс Хатыні. Многія з іх не ўзнавіліся. Спіс спаленых паселішчаў адкрываюць Вялікія Прусы. За два дні — 26 і 27 верасня 1942 года — гітлераўцы знішчылі ў агні 258 чалавек. На ўскрайку вёскі знаходзіцца брацкая магіла, дзе ў 1975 годзе ўстаноўлена стэла.**

Асабліва трагічным для жыхароў Капыльшчыны быў люты 1943-га. У прыватнасці, другога лютага фашысты спалілі вёску Масявічы разам са 130 жыхарамі. Сярод іх 11 дзяцей да двух і 47 — да дванаццаці гадоў. Выжыў толькі адзін чалавек, далейшы лёс якога невядомы. Пасля вайны вёска так і не паўстала з попелу. У 1998 годзе на гэтым месцы ўстаноўлена скульптурная кампазіцыя па праекце галоўнага архітэктара раёна Уладзіміра Чарняўскага. На будаўніцтва помніка збіралі грошы з усяго раёна, калгасаў, арганізацый, прадпрыемстваў.

— У фундамент манумента закладзена капсула са зваротам да нашчадкаў: «Мы — за блакітнае бясхмарнае неба для нашых дзяцей, мы — за далейшае прымірэнне двух народаў, беларускага і нямецкага, за ўмацаванне дружбы і супрацоўніцтва». З нагоды жалобнай даты ў Капыль прыязджала дэлегацыя з Германіі, у тым ліку і прадстаўнікі духавенства. Як толькі госці выйшлі з аўтобуса, адзін з пастыраў прамовіў: «Даруйце нам, мы прыехалі з мірам», — распавёў навуковы супрацоўнік Капыльскага краязнаўчага музея Андрэй Лятчэня.

...2-га і 3 лютага згарэлі разам з жыхарамі вёскі Прагрэс, Рулёва, Калодзезнае. 5 лютага спалены Жавалкі, у агні загінулі 512 чалавек: дзеці, жанчыны, старыя. На заходняй ускраіне вёскі знаходзіцца магіла ахвяр фашызму, на якой у 1967 годзе ўстаноўлены помнік.

Чаму менавіта на пачатку лютага пачалі лютаваць фашысты? Прычын гэтаму, на думку Андрэя Лятчэні, некалькі. Па-першае, ворага раз'юшыла перамога савецкіх войскаў пад Сталінградам. Акрамя таго, на Капыльшчыне быў моцны партызанскі рух. Адразу пасля акупацыі раёна тут былі створаны тры атрады народных мсціўцаў, якія спачатку дзейнічалі асобна, а потым аб'ядналіся ў брыгаду імя К. Я. Варашылава. Ужо 9 мая 1942 года партызаны далі сур'ёзны бой ворагам ва ўрочышчы Гнілуха і знішчылі 700 гітлераўцаў. Дата сімвалічная, бо на той час ніхто не ведаў, што 9 мая наступіць перамога.

Трэцяга снежня 1942-га адбыўся Лаўскі бой — па назве вёскі Лавы. Тут размяшчаўся партызанскі шпіталь, які імкнуліся захапіць фашысты. Атрад імя Катоўскага пад камандаваннем ураджэнца Капыльшчыны, старшыны міліцыі Вікенція Драздовіча атрымаў загад затрымаць ворага на 2-3 гадзіны, пакуль эвакуіруюць раненых. Партызаны наладзілі засаду на могілках. Усе 18 чалавек загінулі, малодшаму, Валодзю Качаноўскаму, было 15, а самаму старэйшаму — 32 гады.

Бясспрэчна, за гэта гітлераўцы жорстка помсцілі мірнаму насельніцтву, імкнуліся зламаць волю да барацьбы: не было на Капыльшчыне сям'і, дзе б ні ваяваў у партызанах муж, бацька, сваяк, знаёмы. Нярэдка фашысты знішчалі ў полымі толькі сваякоў партызан. Для таго, каб даць «урок» іншым жыхарам.

23 лютага 1943 года карнікі загубілі 64 ні ў чым не павінныя жыцці з вёскі Рым (цяпер Дусаеўшчына). Вось як згадвае той страшны дзень сведка жудасных падзей Маіна Фёдараўна Каспяровіч: «Як сёння перад вачыма тое чорнае ранне. Мама, Стасевіч Марыя Пятроўна, падпаліла ў печцы. Дзеці: пяць дачок, хто спаў яшчэ, а хто бегаў па хаце. Муж Марыі — Фёдар Сямёнавіч — ваяваў на фронце... На душы было неспакойна: дайшоў слых, што ў Аножкаўскім лесе партызаны забілі немца...

У другой палове дома прачнулася сям'я Алены Акуліч. Муж яе партызаніў, а на руках у жанчыны было пяцёра дзяцей: Валодзя (1930), Валя (1935), Клара (1938), Лёва (1937), Нэля (1939) гадоў нараджэння. Алена чакала шостае дзіця. Гадаваць малых ёй дапамагала старэнькая маці».

Прадчуваючы бяду, жанчыны з дзеткамі забраліся пад застрэшак хаты і назіралі за дарогай, па якой рухаліся немцы на матацыклах, падводах з саломай. Убачылі, што каля аднапавярховага драўлянага васьмікватэрнага дома насупраць збіраліся вяскоўцы. Жанчыны чулі, як карнікі выклікалі па імёнах членаў партызанскіх сем'яў. Маці Алены Акуліч, баючыся, што падпаляць іх хату, сказала, што трэба ісці да людзей. Усе спусціліся і далучыліся да натоўпу якраз у той момант, калі выклікалі сям'ю Акуліч. Пасля таго, як пераклічка закончылася, карнікі загадалі разыходзіцца тым, каго не назвалі. Сем'і партызан яны зачынілі ў доме, праз вокны накідалі туды саломы і падпалілі...

...У 1970 годзе на брацкай магіле вёскі Дусаеўшчына ўстаноўлены абеліск, побач з ім у 1975-м — скульптура і стэла з імёнамі загінулых.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

*Капыльскі раён.*

# «НАСТАЎНІК ГОДА»: УМОВЫ АДБОРУ ЛЕПШЫХ ЗМЯНІЛІСЯ...

**Конкурс прафесійнага майстэрства педагогаў «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь», які стартуе восенню гэтага года, упершыню пройдзе па новых правілах.**

Лепшых педагогаў збіраюцца вызначыць адразу ў сямі намінацыях: «Фізіка, астраномія, матэматыка, інфарматыка»; «Замежная мова»; «Беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура»; «Музыка, выяўленчае мастацтва, працоўнае навучанне, чарчэнне, фізічная культура і спорт, дапрызыўная падрыхтоўка»; «Гісторыя, грамадазнаўства, геаграфія, хімія, біялогія». Таксама асобна за званне лепшага педагога будуць змагацца настаўнікі пачатковай школы і педагогі дашкольнай адукацыі. Першы этап пройдзе ў сценах устаноў адукацыі, другі этап — раённы (гарадскі), трэці — абласны і чацвёрты — заключны рэспубліканскі. Фінал конкурсу пройдзе восенню 2014 года.

Нагадаем, што рэспубліканскія конкурсы педагагічнага майстэрства праводзяцца, пачынаючы з 1995 года, з перыядычнасцю раз у два—тры гады. Пераможцам апошняга конкурсу «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь» стала ў 2011 годзе настаўніца англійскай мовы дзятлаўскай гімназіі № 1 Інэса Зубрыліна. У першым этапе конкурсу па ўсёй краіне ўзялі ўдзел каля 10 тысяч педагогаў, а ў заключным этапе былі прадстаўлены настаўнікі беларускай і рускай мовы і літаратуры, фізікі, замежнай мовы, матэматыкі, біялогіі, гісторыі, хіміі, геаграфіі і пачатковых класаў. І ніякіх праблем з тым, каб параўнаць педагагічны талент настаўніка фізікі і, скажам, беларускай мовы ў журы не ўзнікала.

Лепшага педагога дашкольнай установы ў Беларусі пакуль не вызначалі. Але ў тым жа 2011 годзе прайшоў першы рэспубліканскі конкурс сярод дашкольных устаноў. Калі прымалася рашэнне аб яго правядзенні, разглядаліся розныя варыянты: праводзіць конкурс або сярод выхавальнікаў, або сярод дашкольных устаноў. Два гады таму вырашылі спыніцца на другім варыянце, паколькі палічылі, што асяроддзе, у якім знаходзіцца дзіця, трэба ацэньваць у цэлым, паколькі ўсё лепшае, што яго акружае, стваралася не адным педагогам, а ўсім калектывам. Цяпер жа «прафесійная дыскрымінацыя» ліквідавана: сярод педагогаў дашкольных устаноў таксама будуць вызначаць лепшага.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

■ Май на ўвазе

# Цвяроза за «баранку трымайся», шафёр

**Пастановай міністэрстваў транспарту і камунікацый і сельскай гаспадаркі і харчавання па ўзгадненні з Міністэрствам аховы здароўя зацверджана інструкцыя аб парадку правядзення кантролю стану кіроўцаў механічных транспартных сродкаў, самаходных машын на прадмет знаходжання ў стане алкагольнага ап'янення ці ў стане, выкліканым спажываннем наркатычных сродкаў, псіхатропных, таксічных ці іншых дурманлівых сродкаў. Дакумент ужо ўступіў у сілу.**

Ён удакладнены з улікам практыкі выкарыстання папярэдняй рэдакцыі інструкцыі. Дакумент вызначае парадак правядзення кантролю юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, што вядуць сваю дзейнасць у галіне аўтамабільнага транспарту, на ажыццяўленне якой не патрэбны спецыяльны дазвол (ліцэнзія), стану кіроўцаў на прадмет «прыняцця за каўнер» ці знаходжання «пад кайфам».

Як паведамілі ў прэс-службе Мінтранса, з улікам шматлікіх зваротаў юрыдычных асоб у інструкцыі ўдакладнена, што прыборны кантроль ап'янення праводзіцца работнікам, прызначаным кіраўніком юрыдычнай асобы ці індывідуальным прадпрымальнікам, у незалежнасці ад яго кваліфікацыі з выкарыстаннем прыбораў, што адпавядаюць патрабаванням тэхнічных нарматыўных прававых актаў, і экспрэс-тэстаў (тэст-палосак, экспрэс-пласцін).

Патрабаваннямі інструкцыі таксама ўстаноўлена, што ў дачыненні да работніка, упаўнаважанага на правядзенне прыборнага кантролю ап'янення, адпаведны прыборны кантроль ап'янення праводзіцца іншым работнікам, прызначаным кіраўніком юрыдычнай асобы ці індывідуальным прадпрымальнікам, або на падставе грамадзянска-прававога дагавора, заключанага з арганізацыяй аховы здароўя. Гэта можа быць і іншая арганізацыя, індывідуальны прадпрымальнік, якія маюць спецыяльны дазвол (ліцэнзію) на ажыццяўленне адпаведнага віду медыцынскай дзейнасці.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 08 октября 2013 г. ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО РУП «БЕЛПОЧТА»

| № лота | Наименование, местоположение и краткая характеристика имущества | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. | Общая площадь, $м^2$ | Коэф. от 0,5 до 3,0 | Цель использования |
|---|---|---|---|---|---|---|
| ЛОТ № 1 | Площади на 2-м этаже капитального строения, здания почтампа (инв. № 100/С-41452), по адресу: Брестская обл., г. Брест, ул. Орловская, д. 67 | 2 162 900 | 216 290 | 100,6 $м^2$, в т.ч. осн.пл. 55,8 $м^2$ (8,7; 9,1; 2,5; 1,4; 3,6; 8,3; 18,6; 3,6 $м^2$), вспом.пл. 44,8 $м^2$ (2,3; 1,3; 18,7; 22,5 $м^2$) | 3,00 | Для размещения офисов, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, производства (кроме вредных производств) |

| | |
|---|---|
| **Предмет аукциона** | Право заключения договора аренды |
| **Наименование арендодателя** | РУП «Белпочта» |
| **Срок договора аренды** | 5 лет |
| **Условия** | 1. С победителем аукционных торгов в течение 10 рабочих дней будут заключены договора аренды нежилых помещений.<br>2. Стоимость права заключения договора аренды должна быть выплачена продавцу в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона за вычетом задатка.<br>3. Возместить Организатору аукционных торгов расходы по их проведению в течение 3-х раб. дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 руб. РБ в рег. дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 369, УНП 102353509 |

**Аукцион состоится 08 октября 2013 г. в 11.00 (лот № 1) по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Последний день приема заявлений – 07 октября 2013 г. до 17.00.**
**Контактные тел.: 8 (0162) 23 92 59, 21 88 81.**

---

### ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение «Минскстрой»**

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ**

объекта «Многоэтажные жилые дома №№ 1, 2 по генплану со встроенными помещениями административно-общественного назначения и гаражом-стоянкой № 3 по г/п в квартале ул. Щорса–пр. Дзержинского на земельном участке 2,0 га с установкой индивидуального источника теплоснабжения. Жилой дом № 2 по генплану».
Продовольственный магазин (5 пусковой комплекс) в г. Минске, *опубликованную в газете «Звязда» 01 июня 2013 года:*

**Ожидаемый ввод продовольственного магазина в эксплуатацию – 8 марта 2014 года.**

*Генеральный директор Н.В. Милошевский*

УНП 100071325

---

### ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение «Минскстрой»**

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ДОЛЬЩИКОВ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ОБЪЕКТА «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 17 по генплану»** в г. Минске, *опубликованную в газете «Звязда» 7 июня 2012 года:*

Ожидаемый ввод жилого дома в эксплуатацию – 01 декабря 2013 г.
Дополнительные соглашения об изменении срока ввода будут заключаться в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

*Генеральный директор Н.В. Милошевский*

УНП 100071325

---

### ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение «Минскстрой»**

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ДОЛЬЩИКОВ И ЗАИНТЕРЕСОВАННЫХ ЛИЦ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЙ В ПРОЕКТНЫЕ ДЕКЛАРАЦИИ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-6. Жилой дом № 12 по генплану» в г. Минске**, *опубликованных в газете «Звязда» 22 ноября 2012 года и 10 января 2013 года:*

Ожидаемый ввод дома в эксплуатацию – 01 ноября 2013 года.
Дополнительные соглашения об изменении срока ввода будут заключаться в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

*Генеральный директор Н.В. Милошевский*

УНП 100071325

---

### ИЗВЕЩЕНИЕ

**Государственное производственное объединение «Минскстрой»**

**ДОВОДИТ ДО СВЕДЕНИЯ ДОЛЬЩИКОВ О ВНЕСЕНИИ ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ О СТРОИТЕЛЬСТВЕ НЕЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ объекта «Жилой район Масюковщина. Микрорайон Масюковщина-3. Жилой дом № 13 по генплану» в г. Минске,** *опубликованную в газете «Звязда» от 22 марта 2011 года № 52:*

Ожидаемый ввод в эксплуатацию нежилых помещений, расположенных во 2 – 9 пусковых комплексах жилого дома, – декабрь 2013 года.
Дополнительные соглашения о переносе сроков окончания строительства будут заключаться в кабинете 105 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 13А.

*Генеральный директор Н.В. Милошевский*

УНП 100071325

---

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «ТОРГМАШ»

| Номер лота | ЛОТ № 1 |
|---|---|
| Наименование объекта | Капитальное строение (инв. № 110/С-4873), площадью 514,0 $м^2$ – здание нежилое, наименование – здание |
| Местонахождение объекта | Брестская обл., г. Барановичи, ул. Чернышевского, д. 61 |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «Брестрайбытсервис» |
| Организатор торгов | РУП «Жилкоммунтехника» Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» Брестское областное управление |
| Начальная цена продажи, руб., без НДС | 911 671 000 |
| Размер задатка, руб. | 91 167 100 |
| Право на земельный участок | Определение фактических границ земельного участка, необходимого для обслуживания продаваемых объектов, будет производиться после продажи, в соответствии с действующим законодательством |
| Условия продажи | Без условий |
| Тип и характеристика объекта | Общая площадь 514 $м^2$, площадь застройки 540 $м^2$, объем здания 2683 $м^3$. Год постройки 1992. Фундамент сборный железобетонный, стены кирпичные, перекрытия железобетонные, крыша рулонная, полы бетонные, плитка, деревянные, проемы оконные деревянные, проемы дверные металлические, деревянные, внутрення отделка штукатурка и окраска. Инженерные коммуникации: отопление, электроснабжение, водопровод, канализация, горячее водоснабжение, вентиляция естественная |
| Срок заключения договора купли-продажи | Не позднее 20-и рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона |
| Условия оплаты | Оплата производистя в соответствии с заключенным договором купли-продажи |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012105618108 руб. РБ в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк» по г. Минску, код 153001369, УНП 102353509 |

**Аукцион состоится 24 сентября 2013 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325 Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с Филиалом «Центр «Белтехинвентаризация».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10, каб. 329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00.**
**Последний день приема заявлений – 23 сентября 2013 г. до 17.00.**
**Контактные тел.: 8 (0162) 23-92-59, 21-88-81.**

---

## РУП «ЖИЛКОММУНТЕХНИКА» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ СОБСТВЕННОСТИ ОАО «Торгмаш»

| Номер лота | ЛОТ № 1 |
|---|---|
